Пралетары ўсіх краін, аднаўчайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАННЯ—XV
№ 234 (4139)
СУБОТА 29 жніўня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА.

„РАЗВІЦЬ УЗМОЦНЕНУЮ РАБОТУ ПА АРГ...

Сяўбу азімых правесьці ў максымальна...

На 25-га жніўня... 2,1 проц.

Прызыў ў РСЧА ператварыць у масавую кампанію ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны

Ва ўмовах узрастаючай ваеннай небясьпекі, пагрозы інтэрвэнцыі СССР з боку капіталістычнага сьвету, у абставінах абвостранай клясавай барацьбы ўнутры нашай краіны, прызыў у рады Чырвонай армії зьяўляецца важнейшай палітычнай кампаніяй.

Чырвоная армія павінна па прызыве атрымаць у свае рады клясава адданых справе рабочай класе прызыўнікоў, пісьменных, здольных аўладаць баявой тахнікай Чырвонай армії і ў патрэбны момант умець дастасаваць яе супроць клясавых ворагаў.

Здавалося-б, што гэту ісьціну, выкладзеную ў розных партыйных і савецкіх дырэктывах, ня прыдзецца паўтараць напярэдадні правядзеньня прызыву. Гэтыя дырэктывы абавязвалі партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія і грамадзкія арганізацыі ператварыць работу па прызыве ў масавую палітычную кампанію, увязваючы яе з агульнымі гаспадарча-палітычнымі задачамі, весьці работу па прызыве штодзённа, а не ад выпадку да выпадку. Асабліва падкрэсьлівалася і зварочвалася ўвага на неабходнасьць дакладнага КЛЯСАВАГА АДБОРУ прызыўнікоў, прыцягваючы да гэтай справы сяміх прызыўнікоў, рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-сярэдняцкіх аднасобных мас і на неабходнасьць ліквідацыі пісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў з тым, каб даць у гэтым годзе Чырвонай армії ЗУСІМ пісьменнае пачаўненьне.

Абсьледаваньне раду раёнаў і гарадоў брыгадамі рабселькораў і работнікамі РКК РСІ выкрыла рад ганебных правакацкіх зігзагаў і прымірэнчых адносін да кулацкіх элемэнтаў пры правядзеньні сацыяльна-клясавага адбору з боку раду сельскіх і раённых камісій і асобных работнікаў раёну і шматлікія факты апартуністычных адносін да справы правядзеньня ўсёй падрыхтоўчай работы наогул.

З сацыяльна-клясавым падборам справа стаіць ня опрыяюча. Па цэлым радзе раёнаў аказалася, што ўся гэта работа праведзена ў гаўнятным парадку, без прыцягненьня грамадзкасьці і саміх прызыўнікоў, у выніку чаго меў месца рад гапавацяпскіх пастаноў з боку сельскіх камісій, якія часта бяз усякага разбору штампуюцца раённымі і гарадзкімі камісіямі. Апрача таго трэба адзначыць, што дзеючыя правапартыйныя недаацэнцы справы правядзеньня прызыву ў радзе раёнаў, уся работа па сацыяльна-клясавым падборы фактычна ўскладзена на райвакаматы.

Брыгада па Глускім раёне паведамляе: «створаная пры РВК камісія ніхто ня кіраваў і яна аказалася не на вышыні пастаўленых перад ёю задач. Яна ня здолела мабілізаваць грамадзкай ўвагі вакол клясавага падбору прызываных ў РСЧА. Работа грамадзкіх, савецкіх партыйных арганізацый абмяжоўвалася толькі прыняцьцем часта нядрэнных рэзалюцый і вылучэньнем работнікаў у райкамісіі па клясавым адборы, але процант выкананьня прынятых пастаноў міззрны. Ніхто не займаўся праверкай па выкананьні вызначаных мерапрыемстваў і якасьцю работы».

Трылесеньскі, Ніканавіцкі і 2-гі Грудзінаўскі сельсаветы (Быхаўшчына) паведамілі раённай камісіі, што сярод дапрызыўнікаў у гэтых сельсаветах «клясава-чужых нямае, пры праверцы-ж аказалася, што ў гэтых сельсаветах былі пішэнцы і рад асоб, якія падлягалі адсеву, Такія-ж выпадкі меліся ў Журавіцкім, Даўсным, Ракцянскім і іншых сельсаветах.

Побач з выпадкамі праваапартуністычнай практыкі ў справе адсеву сацыяльна-чужых элемэнтаў ёсьць рад «левых» загібаў, іграючых на руку клясаваму ворагу. Так камісія пры Менскім гарсавеце вынайшла такі мэтад выкрыцьця сацыяльна-чужых элемэнтаў, да якога не дадумаўся ні адзін з раёнаў БССР. У Менску гэта пытаньне вырашаецца надзвычай проста і адным толькі міліцыянэрам. Варта спыніцца на адным анкетным пісьце на прызыўніка, складзеным вучастковым міліцыянэрам. Даныя з анкеты гавораць, што прызыўнік—член ЛКСМБ, член бюро ячэйкі ЛКСМБ, член саюзу будаўнікоў з 1930 г., працуе па найме з 1928 г. Бацька прызыўніка да рэзалюцыі працаваў на гарбарным заводзе Сальмана, да 1929 г. працаваў у саюзкуры, цяпер працуе на будаўнічых работах, мае ўласны дом і як дамаўласьнік пазбаўлен выбарчых правоў. Прызыўнік са сваімі бацькамі сувязі ня мае.

Вучастковы міліцыянэр у сваім заключэньні піша: «Не дапусьціць у рады Чырвонай армії, бо бацькі зьяўляюцца пішэнцамі і былі буйнымі дамаўласьнікамі».

Бюракраты з камісіі Менгарсавету штампуюць: «Не дапусьціць у РСЧА як сына буйнога дамаўласьніка, пазбаўленага выбарчага права».

Так «спосаб» адбору трэба адзначыць Замест таго, каб паставіць гэта пытаньне на абмеркаваньне камсамольскай ячэйкі, у якой знаходзіцца прызыўнік, абмеркаваць на сходзе рабочых і выявіць сапраўдны твар прызыўніка і калі аказацца, што прызыўнік прымазаўся, дык яго выкінуць з КСМ, калі ён добры камсамолец, дык накіраваць яго ў рады РСЧА,—камісія штампуе заключэньне вучасковага міліцыянэра.

Ня пепш стаіць справа з ЛІКВІДАЦЫЯЙ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ І МАЛАПІСЬМЕННАСЬЦІ СЯРОД ПРЫЗЫЎНІКОЎ. Наркамасьветы і яго органы на месцах, прафсаюзы, камсамол і грамадзкія арганізацыі гэтаму пытаньню не надалі ніякага значэньня і ў большасьці выпадкаў акрамя рэзалюцыі ніякіх значных вынікаў няма. Пытаньнямі ліквідацыі малапісьменнасьці фактычна ніхто не займаўся. У гэтай галіне ёсьць вялікая доля простага «очковтирательства».

Па паведамленьні брыгад па ГЛУСКІМ раёне было на вучобе 47 чал. няпісьменных.

Па Жлобінскім раёне райваенкаматам былі выяўлены 43 няпісьменных прызыўнікі. Няпісьменнасьць яшчэ дагэтуль не ліквідавана.

Па былым Чачавіцкім раёне праверка пасьпяховасьці дапрызыўнікоў па ліквідацыі няпісьменнасьці была ўскладзена на загадчыка справаводзтва РК.

Характэрна, што па ўсіх гэтых пытаньнях кіруючыя арганізацыі раёнаў прыняли рад пастаноў, але праверкай выкананьня вельмі рэдка займаюцца.

Побач з добрымі прыкладамі ўдзелу КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ у падрыхтоўчай рабоце да прызыву, ёсьць рад выпадкаў поўнай адсутнасьці масавай работы камсамолу сярод прызыўнікоў, дранжнага ўдзелу ў справе клясавага адбору і ліквідацыі няпісьменнасьці.

ПРАФСАЮЗЫ ў раёнах, як правіла, ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы да прызыву ня прымаюць.

Ня гледзячы на тое, што да пачатку прызыву засталося ўсяго некалькі дзён, усе паказаныя перагібы і недахопы МОЖНА І НЕАБХОДНА выправіць. РК КП(б)Б і РВК неабходна перагледзець работу камісій па выяўленьні клясавачужых элемэнтаў і выправіць тыя загібы, якія былі дапушчаны, прыцягваючы да гэтай справы шырокія масы рабочых, калгасьнікаў і беднаты.

Райінспэктарам Нарасьветы трэба ўпічыць пэрсанальна няпісьменны склад прызываных, прымацаваць іх да пэўных асоб, якія адказвалі-б за гэтую справу і ліквідацыю няпісьменнасьці не заканчваць у дзень пачатку прызыву, а весьці яе аж да адпраўленьня прызыўніка ў вайсковую часьць.

Камсамольскім арганізацыям неабходна апрача шырокай масавай работы, разгарнуць работу ПА ЎЦЯГНЕНЬНІ Ў КАМСАМОЛ прызыўнікоў рабочых і пешых ударнікаў-калгасьнікаў і па рэкамэндацыі пешых камсамольцаў-прызыўнікоў У ПАРТЫЮ.

ПЕРШЫ-Ж ДЗЕНЬ ПРЫЗЫВУ ТРЭБА ПЕРАТВАРЫЦЬ У МАСАВУЮ КАМПАНІЮ ПА ПЫТАНЬНЯХ УМАЦАВАНЬНЯ АБАРОНЫ КРАІНЫ.

З пачатку прызыву работа, зьвязаная з ім, не павінна спыніцца ані наадварот, маючы скарочаныя тэрміны, неабходна работу паставіць такім чынам, каб даць у гэтым годзе Чырвонай армії клясава-адданае і зусім пісьменнае папаўненьне.

ЗВОДКА

аб ходзе ўборкі і апрацоўкі ільнупа раёнах БССР на 25 жніўня *)

Назва раёнаў	Выпраблена ільну ў проц. да пляну.	Абмолена і абмалочана ў проц. да выпраблен.	Замочана і разасьлана ільну ў проц. да выпраблен.
Паўднёвая зона:			
Брагінскі	100	50,3	43,6
Буда-Кашалёўскі	100	46,6	41,3
Бабруйскі	81,5	98,4	89,2
Веткаўскі	100	—	3,5
Глускі	78,6	—	32,6
Гомельскі	53,0	—	—
Жыткавіцкі	54,8	—	7,6
Жлобінскі	100	25,5	49,4
Кармянскі	89	—	—
Камарынскі	81	—	—
Ельскі	100	81,7	54,1
Лёўскі	100	—	—
Любаньскі	95,9	33,9	20,0
Лельчыцкі	100	—	—
Мазырскі	97,5	—	—
Нараўлянскі	80,8	6,1	—
Парыцкі	100	48,7	11,3
Пятрыкоўскі	93,6	—	—
Рагачоўскі	92,7	56,3	—
Рэчыцкі	100	67,5	50,6
Слуцкі	71,5	82,5	—
Старобінскі	98,7	—	—
Стара-Дароскі	80,4	9,4	7,7
Тураўскі	69,5	4,1	4,1
Церахаўскі	100	16,7	16,7
Чачэрскі	100	56,6	59,6
Чырвона-Польскі	100	41,9	41,9
Чырв.-Слабодзкі	49,6	—	—
Уваравіцкі	100	21,1	1,9
Хойніцкі	100	17,5	17,5
Усяго па паўднёвай зоне:	93,3	29,4	24,6
Цэнтральная зона:			
Асіпавіцкі	87,4	0,4	0,4
Быхаўскі	57,6	2,0	2,0
Барысаўскі	35,2	9,2	9,2
Вялыніцкі	74,6	—	—
Вятомльскі	8,9	—	—
Барэзінскі	100,0	—	—
Горацкі	52,9	0,8	0,7
Заслаўскі	35,2	0,1	0,1
Клімавіцкі	98,5	22,0	6,8
Крупскі	62,1	0,9	0,9
Капыльскі	46,4	7,1	3,4
Касьцюковіцкі	55,5	5,7	4,8
Клічаўскі	100	—	—
Койданаўскі	36,2	—	—
Крычаўскі	87,3	22,2	21,6
Лагойскі	76,1	—	—
Магілеўскі	75,2	—	—
Мсьціслаўскі	43,7	2,4	2,4
Менскі	13,9	0,6	—
Прапойскі	97	51,1	26,7
Пухавіцкі	79,3	2,1	1,8
Плешчаніцкі	8,7	—	—
Смалявіцкі	88,7	31,1	23,4
Талачынскі	73,5	4,7	4,7
Чэрвеньскі	87,8	6,2	2,6
Чавускі	85,6	6,2	5,6
Чэрыкаўскі	73,4	4,4	4,4
Шклоўскі	92,3	—	—
Вузьдзенскі	76,5	31,3	5,8
Усяго па цэнтральнай зоне:	64,9	4,3	3,4
Паўночная зона:			
Асьвейскі	22,3	—	—
Аршанскі	61,1	20,1	14,3
Бешанковіцкі	23,8	—	—
Віцебскі	29,2	4,4	4,4
Вушацкі	67,3	—	—
Гарадоцкі	69,1	43,5	42,0
Дуброўенскі	78,9	21	12,8
Дрысенскі	32,8	46,4	39,4
Лёзьнянскі	87,5	1,4	1,4
Лепельскі	68,3	0,9	0,8
Полацкі	29,2	—	—
Расонскі	7[illegible]	9[illegible]	9[illegible]
Сураскі	81,8	5,2	5,2
Сеньненскі	56,6	6,3	6,3
Сіроцінскі	54,8	16,1	16,1
Чашніцкі	49,6	9,4	8,1
Усяго па паўночнай зоне:	60,7	16,5	16,5
Па БССР:	69,2	13,0	13,0

*) Без паказальнікаў па саўгасах.

19 паўночных раёнаў сарвалі раньнюю сяўбу азімых

Аб слабым разгортваньні сяўбы азімых гаворыць апошняя зводка НКЗБ. Калгасамі па ўсёй рэспубліцы засеяна 2,1 проц. пляну. 25-га жніўня паўночная раёны павінны былі СКОНЧЫЦЬ сяўбу азімых. Між тым, з 10 раёнаў паўночнай зоны пачалі сяўбу толькі 7 (Аршанскі, Гарадоцкі, Дуброўенскі, Дрысенскі, Лёзьнянскі, Расонскі і Сураскі) і засеялі 7,7 проц. пляну.

Гэтыя даныя з усёй выразнасьцю паказваюць, што раньняя сяўба азімых у паўночнай зоне сарвана. Дырэктыва аб правядзеньні сяўбы за 10 дзён паўночнымі раёнамі ня выканана. Дзевяць раёнаў — Асьвейскі, Бешанковіцкі, Віцебскі, Вушацкі, Лепельскі, Полацкі, Сеньненскі, Сіроцінскі і Чашніцкі — яшчэ не пачыналі сяўбу. Што гэта, калі не апартуністычная стаўка на самацёк, якая вядзе да падрыву арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў і грае на руку клясаваму ворагу.

Апартуністычнай недаацэнцы раньняга пасеву азімых і бязьдзейнасьці раённых арганізацый паўночных раёнаў трэба паклясьці канец

Ход сяўбы па ЦЭНТРАЛЬНЫХ РАЁНАХ таксама выклікае трывогу за свайчасовае правядзеньне раньняй сяўбы. 30-га жніўня — апошні тэрмін сяўбы па гэтых раёнах. Пачалі сяўбу толькі 15 раёнаў з 29.

ПАЎДНЁВЫЯ РАЁНЫ павінны скончыць сяўбу 5-га верасьня, а пачалі сяўбу толькі 8 раёнаў з 30.

Задача ўсіх раённых арганізацый — зараз-жа скончыць падрыхтоўчую работу і разгарнуць масавую сяўбу азімых. Дырэктыва партыі аб правядзеньні сяўбы ў максымальна кароткі тэрмін павінна быць безагаворачна выканана.

У Плешчаніцах апартуністы скарачаюць плян пасеву азімых

ПЛЕШЧАНІЦЫ. Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы па Плешчаніцкім раёне праходзіць самацёкам. Ні райкалгасаюз, ні райземчастка ня ведаюць аб падрыхтоўцы да сяўбы калгасаў і аднаасобнага сэктару.

Дваеньне папару ва многіх калгасах не праведзена. Калгас імя Дзяржынскага з 90 гэктараў папару падвоіў толькі 15 гэкт. Многія калгасы яшчэ ня скончылі рыхтаваць насеньне для засеву. Ачыстка насеньня не праводзіцца з-за адсутнасьці збожжаачышчальных машын. У гэты самы час на складах райкаапсаюзу збожжаачышчальныя машыны ляжаць нескарыстанымі.

Некаторыя калгасы ігнаруюць радковы пасеў. На складзе райкаапсаюзу стаяць цэлы год 6 радковых сявярак. Раённыя арганізацыі таксама не клапоцяцца, каб гэтыя машыны прасунуць у калгасы.

Дрэнна праходзіць завоз штучнага ўгнаеньня. У раён трэба было завезьці 2.679 тон вапны, а завезена толькі 5 тон. Паводле пляну намечана завезьці 262 тоны фасфарытнай мукі, завезена толькі 69 тон. Прысланыя на адрас райкаапсаюзу ў ліпені месяцы 10 вагонаў штучнага ўгнаеньня былі выгружаны ў Барысаве пад адкрытым небам. Калгасы («1 мая») бралі мокрае ўгнаеньне. Яшчэ да гэтага часу на станцыі ляжыць вагон замочанага ўгнаеньня.

Некаторыя сельсаветы пайшлі на лініі апартуністычнай практыкі і зьнізілі пляны навыя заданьні па засеве азіміны. Так, Амішаўскі сельсавет зьнізіў плян азімага кліну на 54 гэкт., Каменскі — на 35 гэкт. РК КП(б)Б абвешчана вымова сакратаром парт'ячэек гэтых сельсаветаў.

У раёне сяўба амаль не пачыналася. Толькі калгас «1 мая» і «Камінтэрн» засеялі невялікую плошчу. Калгас «1 мая» засеяў 27 гэкт.

Раённыя партыйна-савецкія арганізацыі павінны па-баявому пераключыцца на асеньнюю сяўбу і зьніштыць усе тормазы, якія затрымліваюць раньні пасеў збожжа.

Брыгадзір «Зьвязды»:
М. Сакалоўскі.

Сушка ін...

Лён выцерабл...

ДРЫСА. Калгас «Перамога», Цястоўскага сельсавету, скончыў ільнацерабленьне 19 жніўня. У калгасе шырока ўжывалася канвэерная сыстэма пры ўборцы і першапачатковай апрацоўцы ільну. У выніку гэтага ўвесь лён ачо...

70 проц. ільну абм...

Уваравічы. Калгас імя Будзённага, Уваравіцкага раёну, паказвае бальшавіцкія тэмпы работы ва ўборцы ільну. У калгасе 100 гэкт. ільну. 95 гэкт. выцераблена яшчэ ў другой пяцідзеўцы жніўня месяца. Ня гледзячы на дажджы, рэшту — 5 гэкт. — калгас убраў у трэцяй пяцідзеўцы. На 21 жніўня ўжо абмалочана 70,5 тон ільнасаломы. Абмалот працягваецца.

Калгас выцерабіў і замачыў 24 пуды пласконьня з 2 гэкт. засеву канапель.

Посьпехі ў ... вільна арганізаў... выдзельшчыны, ... працу ўсіх жалчых (у калгасе арганізаваны дзіцячыя ясьлі).

Асобныя брыгады вядуць паміж сабой сацспаборніцтва, а ўвесь калгас спаборнічае з калгасам «Чырвоны шлях» па лепшую і хутчэйшую ўборку і апрацоўку ільну і ўраджаю збожжавых.

А. Казіміраў.

КАРМЫ

НІ ГЭКТАРА няўбранай сенажа...

ДА АДКАЗНАСЬЦІ ЗА „ОЧКОВТИРАТЕЛЬСТВО"

ПЛЕШЧАНІЦЫ.

У зводцы Наркамзему на 15-га жніўня было паказана, што Плешчаніцкі раён поўнасьцю скончыў сенаўборку. Але на нарадзе старшынь праўленьняў калгасаў выявілася, што ўборка сенажаці на 16-га жніўня выканана толькі на 84 проц. Райва Плешчаніцкага раёну займаецца «очковтирательством», паведамляючы Наркамзему зусім няправільныя лічбы.

З 86 калгасаў толькі ў 68-мі ўведзена зьдзельшчына. У некаторых калгасах ёсьць тэндэнцыя зьнізіць нормы выпрацоўкі (калгас «Перамога»). Раённыя арганізацыі пытаньням зьдзельшчыны аддаюць мала ўвагі.

Калі ўпаўнаважаны ЦК КП(б)В тав. Бабкоў умёо прапанову, каб 23-га жніўня на бюро РК КП(б)В разгледзець пытаньне аб зьдзельшчыне і ўліку працы ў калгасах, дык гэта прапанова была адхілена.

Сакалоўскі.

ПАТРЭБНА ДАПАМОГА

Саўгасы Белсаўгастрэсту яшчэ ня скончылі ўборкі сенажацяй. На 25 жніўня скошана 21.068. гэкт.— 95.5 проц. Убрана толькі 20. 548 гэкт.

Рад саўгасаў ганебна цягнуцца ў тыле сенаўборкі. Так, саўгас «ЛЕСКІ» скасіў 430 гэкт. — 68 проц. пляну. Саўгас «КАПАЦЗВІЧЫ» з 5.000 гэк. скасіў толькі 2.556 — 51 проц. Саўгас «ДУБРОВА» яшчэ не скасіў 2[illegible] проц. сенажаці. Саўгас «НАТАЛЬЛЕЎСК» скасіў толькі 69 проц. сенажаці і саўгас «РЭВАНІЧЫ»—64 проц.

Як відаць, гэтыя саўгасы наўрад ці самі справяцца з уборкай сена.

СТАРОБІНСКІ І ЧЭРВЕНСКІ РАЙВЫКАНКОМЫ павінны аказаць саўгасам канкрэтную дапамогу. Наўкольныя калгасы павінны вылучыць брыгады касцоў і грабельнікаў і паслаць іх на дапамогу саўгасам.

СКОНЧЫЛІ ... 30 ... ЛЕЛЬЧ...

нацыяна... сенажаці... кладзена... Калгас... няй сяўбы.

„Аб'ект... Кажарска...

КАПЫЛЬ. (На... пляну сіласаваньн... ёне зрываецца. Пляц... 23 жніўня выканана толь... Будаўніцтва сіласавальнікаў (... шы, вежы) на 29.428 кбм. выканана на 20%.

З боку райкалгасаюзу, райва, МТС і некаторых партыйна-камсамольскіх ячэек калгасаў усё яшчэ праяўляецца бязьдзейнасьць і недаацэнка сілясу.

Зоатэхнік райкалгасаюзу КАЖАРСКАЯ на запытаньне, якія калгасы ганебна адстаюць у сіласаваньні, адказала: «Ганебна ніхто не адстае, у кожным калгасе ёсьць свае аб'ектыўныя прычыны».

Такія апартуністычныя разважаньні в боку некаторых раённых працаўнікоў прыняли да зрыву сіласаваньня.

Цакарэнка

НІ АДНЭЙ ТОНЫ

ЛЮБАНЬ. Паводле пляну сельсавет пав... асобным с... ным 90 г... Для в... штаб і і... зруху ... ны сел... тыйна-... цыяты... тага не...

Лепшы памочнік партыйных арганізацый

Усебеларускі рабселькораўскі зьезд сваіх рэзалюцыях падкрэсьліў, што «НЕАБХОДНА САМЫМ ШЫРОКІМ ЧЫНАМ РАЗГАРНУЦЬ ВЫДАНЬНЕ Ў КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ ПАЛЯВЫХ І ПАХОДНЫХ ГАЗЭТ». Сёньня мы пачынаем праверку выкананьня гэтай адной з важнейшых пастаноў зьезду.

У рэдакцыйным артыкуле «Зьвязды» ад 26 ліпеня пад назвай «ПАШЫРЫЦЬ ВОПЫТ ЕЛЬСКАГА РАЁНУ» мы паставілі задачу перад усімі сельскорамі — «НАДЫХОДЗЯЧУЮ ЎБОРАЧНУЮ КАМПАНІЮ СПАТКАЦЬ ТЫСЯЧАМІ НОВЫХ ПАЛЯВЫХ БРЫГАДНЫХ ПЕРАСОЎНЫХ ШТОДЗЕННЫХ ГАЗЭТ І АПЭРАЦЫЙНЫХ БЮЛЕТЭНЯЎ». Мы падкрэсьлілі, што «КОЖНАЯ БРЫГАДА, КОЖНЫ ЦЭХ, КОЖНЫ КАЛГАС, САЎГАС, МАШЫНА-ТРАКТАРНАЯ СТАНЦЫЯ І НАСЕЛЕНЫ ПУНКТ ПАВІННЫ МЕЦЬ ПАСТАЯННА ВЫХОДЗЯЧЫЯ, НЕ АДСТАЮЧЫЯ АД ТЭМПАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА НАСЬЦЕННЫЯ ГАЗЭТЫ ПРЫ АБАВЯЗКОВАЙ УМОЗЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА».

За месячны тэрмін пасьля ўсебеларускага зьезду сельскоры, перабудоўваючы сваю работу, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, у СОТКАХ калгасаў арганізавалі выданьне ПАЛЯВЫХ ШТОДЗЕНАК, якія штурмавалі і штурмуюць палі ўборачнай, зьяўляюцца ЛЕПШЫМІ ПАМОЧНІКАМІ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У СПРАВЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ Ў ЖЫЦЬЦЁ ПАСТАНОЎ ЧЭРВЕНЬСКАГА І ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМАЎ ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. Аб гэтым зусім ясна гаворыць надрукаваныя сёньня шматлікія матар'ялы з дзесяткаў калгасаў БССР.

Чым, як ня лепшым атэстатам баяздольнасьці палявых штодзенак зьяўляецца тое, што кулакі і падкулачнікі ў розных мясцох прынялі ў штыхі першыя-ж нумары штодзенак? Кулацкая зграя сваёй агентурай пачула ў палявых штодзенках вялікую для сябе небясьпеку. Таму зусім зразумела, што кулакі і падкулачнікі, пралезшыя ў калгас, усялякімі спосабамі імкнуцца сарваць работу штодзенак. Адсюль задача ўсіх партыйных арганізацый, кожнага партыйца паасобку, па прыкладзе ельскіх і асьвейскіх таварышоў яшчэ больш узмацніць сваю пільнасьць да кулацкіх вылазак, узмацніць кіраўніцтва, увагу і дапамогу нізавому другу і рабселькорам.

За апошні час нам вядома аб дзьвох характэрных праваапартуністычных вылазках супроць калгаснага нізавога друку: заява сакратара ДАУГОВІЦКАЙ камсамольскай ячэйкі тав. ЛЕГАНЬКОВА, што «ЗАРАЗ МЫ ПРАВОДЗІМ УБОРКУ І НЯМА ЧАСУ ЗАЙМАЦЦА НАСЬЦЕНГАЗЭТАМІ І РАБСЕЛЬКОРАМІ» (па матар'ялах газэты «РАБСЕЛЬКОР») і другая заява старшыні рабчкому ТАНЕЖЫЦКАЙ МТС тав. ВАСІЛЕНКІ на куставым партыйным сходзе, што «З НАСЬЦЕНГАЗЭТАМІ Ў КАЛГАСАХ ДАЛЁКА НЕ ЗАЕДЗЕШ, ЛЕПШ-БЫ ГЭТЫ ПАТРАЧАНЫ ЧАС НА ВЫПУСК ГАЗЭТЫ СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ ЎБОРКІ». Упошнім выпадку гэту апартуністычную думку „нават падтрымаў сакратар Чырвона-Слабодзкага РК КП(б)Б тав. КРАЦАР.

Хто апрача апартуністаў можа адлучаць работу бальшавіцкага друку ад усёй іншай работы па мабілізацыі калгасных мас на бальшавіцкае правядзеньне ўборкі? Іменна праз друк, у тым ліку і нізавыя саўгасна-калгасныя газэты, як «САМУЮ МОЦНУЮ, САМУЮ ВОСТРУЮ ЗБРОЮ ПАРТЫІ» мы павінны мабілізаваць шырокія калгасныя масы на пасьпяховае скончэньне ўборкі.

Якімі бледнымі зьяўляюцца апартуністычныя заявы гэтых гора-кіраўнікоў аб непатрэбнасьці ў часе ўборкі займацца друкам і рабселькорамі на фоне ТЫХ БЛІСКУЧЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ ПАЛЯВЫХ ГАЗЭТ «УДАРНІК УБОРАЧНАЙ», аб якіх сёньня надрукавана ў «Зьвязьдзе». ПА ТАКІХ АПАРТУНІСТЫЧНЫХ «ЗАЯВАХ» МЫ ПАВІННЫ БЯЗЬЛІТАСНА БІЦЬ, ВЫКРЫВАЦЬ ІХ.

У гэтым годзе мы ўпяршыню маем масавае выданьне палявых штодзенак. ШТОДЗЕНКА зарэкамэндавала сябе, як БАЯВОЕ ЗЬВЯНО БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ, як надзейны памочнік партыйных арганізацый у барацьбе за генэральную лінію партыі, за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, супроць кулацтва і яго агентуры — апартуністаў усіх масьцей. Наша задача зараз — як найпаўней абагуліць увесь вопыт выданьня штодзенак з тым, каб яшчэ з большым размахам скарыстаць выданьне плянавых газэт зараз у часе асеньняй пасеўнай кампаніі і асабліва шырока ў часе будучай веснавой пасеўнай кампаніі.

Уборачная кампанія хутка канчаецца, але заваяваных ў сотнях калгасаў бальшавіцкіх тэмпаў работы нізавога друку і селькораў мы НЕ ПАВІННЫ ЗДАЦЬ. Набыты вопыт павінен быць замацован. Мы павінны дабіцца, каб насьценгазэты выходзілі ў саўгасах і калгасах не разавей, чым раз у 3-5 дзён. У буйных саўгасах і калгасах выданьне штодзённае павінна быць ЗАМАЦАВАНА НА ЎВЕСЬ ПЭРЫЯД. У гэтай справе значную дапамогу аказуць дзесяткі тысяч спэцыялізаваных мажетаў, прыстасаваных да розных гапін сельскай гаспадаркі, якія ў бліжэйшыя дні выдае газэта «РАБСЕЛЬКОР» і «СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ РАБОЧЫ».

Аднак, мы яшчэ раз напамінаем, што асноўнай умовай завяршэньня перабудовы рабселькораўскага руху зьяўляецца ўзмацненьне, канкрэтызацыя і дыфэрэнцыяцыя штодзённага партыйнага кіраўніцтва кожнай шматтыражкай, кожнай насьценгазэты. Рабселькоры БССР пад кіраўніцтвам, партыйных арганізацый паказалі ўзор падрыхтоўкі да 2-га ўсебеларускага зьезду, рабселькоры БССР павінны паказаць і пакажуць бальшавіцкія ўзоры ажыцьцяўленьня яго пастаноў.

1-га верасьня склікаецца

чарговы пашыраны Пленум Менскага Гаркому КП(б)Б

З удзелам членаў бюро парткалектываў, і ячэек КП(б)Б, дырэктароў прадпрыемстваў, старшынь фабзаўмясцкомаў (партыйнае), сакратароў сельпарткомаў і сельячэек КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1. Вынікі перавыбараў бюро ячэек і далейшыя задачы партарганізацый. (Дакл. тав. КАВАЛЬЧУК).

2. Папярэднія вынікі ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі і далейшыя задачы па арганізацыйна-гаспадарчым узмацненьні саўгасаў і калгасаў. (Дакл. тав. КАРАНЕЎСКІ).

Пленум адкрываецца ў 6 гадзін вечара, памяшканьні Дому Камасьветы (б. клюб Карла Маркса).

Члены ЦК КП(б)Б, члены Пленуму Гаркому і рэвіз. камісіі ўваходзяць па сваіх пасьведчаньнях, а іншыя—па білетах Гаркому, якія сакратары яч. павінны атрымаць у Гаркоме.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

МА...

800 ільнамалатарань „Эддзі"—даць да 1-га ...

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ВЫКАНАНЬНЯ ПРЫ СНК БССР

Заслухаўшы паведамленьне сакратара камісіі выкананьня тав. Элькіна аб выніках праверкі выкананьня Белсамправсаюзам і Белмэталяаб'яднаньнем дырэктыў ураду аб вырабе да ўборачнай кампаніі ільнамалатарань тыпу «ЭДДЗІ»,—камісія выкананьня лічыць успоўленым, што прынятыя з боку Белсамправсаюзу і Белмэталяаб'яднаньня захады не забясьпечылі свайчасовага і поўнага выкананьня пастановы СНК БССР за 24-VI г. г. «Пра арганізацыю вытворчасьці машын па абмалоце галовак ільну» (пратакол № 12, п. 47) і пастановы камісіі выкананьня ад 17-VIII 1931 г. «Пра выкананьне дырэктыў ураду аб вырабе с.-г. машын і інвэнтару да ўборачнай кампаніі» (пратакол № 13, п. 7).

У прыватнасьці камісія выкананьня адзначае:

а) Тэрміны вырабу і адгрузкі валаў і падшыпнікаў для ільнамалатарань «Эддзі», якія прадугледжаны дагаворам, заключаным паміж Белсамправсаюзам і заводам «Камунар», не адпавядаюць устаноўленым (паказанымі пастановамі СНК і камісіі выкананьня) тэрмінам здачы Белсельгасснабу 800 штук ільнамалатарань.

б) Завод «Камунар» ня выканаў заключанай з Белсамправсаюзам умовы па вырабе валаў і падшыпнікаў (замест вырабу і адгрузкі да 15-VIII 60 проц. агульнай колькасьці валаў і падшыпнікаў, фактычна адгружана да 22-VIII 42 проц. і на 26-VIII 57 проц.)

в) Частка выпушчаных і адгружаных заводам «Камунар» валаў і падшыпнікаў у выніку нядбайных адносін да якасьці прадукцыі не адпавядае неабходным разьмерам, што выклікае дадатковую работу па прыстасаваньні валаў і падшыпнікаў і тым яшчэ больш аслабляе тэмпы зборкі машын «Эддзі».

г) Белсамправсаюз не забясьпечыў на лежным тэмпаў работы сваіх арцеляй, з прычыны чаго з агульнай колькасьці 800 штук на 25-VIII фактычна сабрана толькі 190 машын.

Адзначаючы памылёнае, камісія выкананьня пастанаўляе:

1. Абавязаць Белмэталяаб'яднаньне пад адказнасьць тав. Левіна і дырэктара заводу «Камунар» тав. Эрынгроза: а) арганізаваць работу па вырабе валаў і падшыпнікаў з такім разьлікам, каб апошняя партыя іх была адгружана не пазьней 30-га жніўня 1931 г., б) устанавіць суровы кантроль за якасьцю валаў і падшыпнікаў, зараз-жа зьяўляючыўся непаладкі, вядучы рашучае змаганьне з нядбайнымі адноснамі да расточкі валаў і падшыпнікаў.

2. Абавязаць Белсамправсаюз пад адказнасьць старшыні Белсамправсаюзу тав. Брыскіна і дырэктара Мэталяаб'яднаньня тав. Таўкачова прыняць самыя рашучыя захады да таго, каб да ўстаноўленага камісіяй выкананьня тэрміну (1-га верасьня 1931 г.) поўнасьцю выканаць вырад 800 ільнамалатарань «Эддзі», для чаго: а

...мплектаваць ...йнай асьветы

...ВАЯ ЗВОДКА

...ня падручнікаў для сеткі партасьветы (на 28 жніўня)

...ДРУЧНІКА	Аўтар.	У якім стане.
...НІЗМУ	АЛЬХОВЫ	У стыльрэдакцыі
...ЕНІЗМУ	СТАЛІН	У друку
...А ГІСТОРЫІ УсеКП(б)	БУБНОЎ	У друку.
...УсеКП(б)	ЯРАСЛАЎСКІ	У стыльрэдакцыі.
...АЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ		
...ОРЧАСЬЦІ	БУРДЗЯНСКІ	Галоўліт.
...А ЛЕНІНІЗМУ	КЕРЖАНЦАЎ	
	І ЛЯВОНЦЬЕЎ	У перакладзе
...СЫ ГІСТАРЫЧНАГА	ВАЛЬФСОНА	
...АТЭРЫЯЛІЗМУ	І ГАК	У перапліце.
...А. РУХ	МОНАСАЎ	У друку.
...СТОРЫЯ УСЕКП(б)	ПАПОВА	Вышла.
...УСКАЯ ГІСТОРЫЯ ч. І І ІІ.	ПАКРОЎСКІ	У друку.
ГІСТОРЫЯ УсеКП(б)	ВАЛАСЕВІЧ	У друку.
...ДЫЯЛЕКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛІЗМ	БЫХАЎСКІ	У перапліце
ГІСТОРЫЯ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ	БАЧАРАЎ	
	І ЮАНІСІЯНІ	Галоўліт
ПАЛІТЭКАНОМІЯ	ЛАПІДУС	
	І АСТРАВІЦЯН	Галоўліт

...ых. ...па- ...вучобы ...бамірскі.

Усім райпарткомам

НА ГЛЕДЗЯЧЫ НА КАТЭГАРЫЧНУЮ ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б АБ НЕДАПУШЧАЛЬНАСЬЦІ ЗАТРЫМАНЬНЯ АДПУШЧАНЫХ РАЙКОМАМІ КАМУНІСТАЎ У НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ, НАГЛЯДАЮЦЦА МАСАВЫЯ ПАРУШЭННІ ГЭТАЙ ПАСТАНОВЫ, ШТО ЗРЫВАЕ КАМПЛЕКТАВАНЬНЕ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ.

КАТЭГАРЫЧНА ПРАПАНУЕЦЦА СПЫНІЦЬ ЗАТРЫМАНЬНЕ ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ КАМАНДЫРУЮЦЦА НА ВУЧОБУ.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б Г Е Й.

Нараду правесьці не ўдалося...

Падрыхтоўка да партвучобы па Жлобінскім раёне распачалася 10 жніўня. Райкомам партыі складзена вучэбная сетка партыйнай асьветы.

Для кіраўніцтва школамі в 1-га верасьня будуць праведзены курсы для гораду на 40 чалавек і для вёскі на 35 чалавек. З 5 па 15 верасьня будуць праведзены курсы прапагандыстаў. У раёне адчуваецца вялікі недахват у прапагандыстах, асабліва на вёсцы. Не хапае таксама 2-х штатных прапагандыстаў. Партвучоба павінна пачацца па горадзе 15-IX і па вёсцы з 1-X. Камплектаваньне школ па горадзе пачнецца з 10-IX, а па вёсцы з 20-IX.

Аднак, рад ячэек не разгарнулі яшчэ падрыхтоўкі да вучобы. Калі на 23-га жніўня склікалася нарада сакратароў ячэек па пытаньні падрыхтоўкі да вучобы, дык папова сакратароў ячэек не зьявілася. Такім чынам, нараду правесьці не ўдалося.

Гэты факт гаворыць аб наяўнасьці недаацэнкі партыйнай асьветы. Трэба рашуча ўдарыць па тых, хто ня хоча зразумець важнасьці партвучобы. Часьлед

Машніцкі.

Партасьвету на транспарце на вышэйшую ступень

Праведзены агляд становішча партыйнае асьветы на транспарце паказаў, што пры наяўнасьці асобных дасягненьняў у арганізацыі сеткі партасьветы і паварот па да ўвагі вучобы з вытворчасьцю ўсё-ж яна далёка не заняла патрэбнага месца ва ўсёй рабоце і адстае ад агульных тэмпаў рэканструкцыі транспарту. Ахват партыйцаў сеткай партасьветы на 24,4 проц., беспартыйных — на 2,3 проц. пацьвярджае факт адставаньня.

Разгортваньне партыйнай прапаганды на транспарце павінна выходзіць з задач 100 проц. абавязковага ахопу сеткай партасьветы кандыдатаў і новых членаў партыі. Неабходна шырока ўцягнуць у сетку партасьветы беспартыйных рабочых актыў і асабліва жанчын.

Зараз партарганізацыі транспарту ўсю ўвагу павінны накіраваць на рэалізацыю дырэктывы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні камплектаваньня сеткі партасьветы ў адпаведнасьці з вытворчым характарам і ўмовамі транспарту.

Неабходна ўцягнуць усіх партыйцаў, камсамольцаў, беспартыйных у работу па камплектаваньні. Трэба ўжыць такія формы, ЯК АРГАНІЗАЦЫЯ МАСАВЫХ ВЕЧАРОЎ, КУЛЬТЭСТАФЭТ, прысьвечаных партасьвеце, арганізацыя брыгад па вярбоўцы і ўкамплектаваньні.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва паміж цахамі, зьменамі, брыгадамі, асобнымі вузлами на лепшае камплектаваньне і пастаноўку партвучобы павінна магутным вагаром у справе практычнай дапамогі партарганізацыі ў рэканструкцыі транспарту.

Вучоба павінна праводзіцца пад лёзунгам «УДАРНІК НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ —АКТЫЎНЫ СЛУХАЧ СЕТКІ ПАРТАСЬВЕТЫ, КОЖНЫ СЛУХАЧ СЕТКІ ПАРТАСЬВЕТЫ — УДАРНІК НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ».

Неабходна наладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва сеткай партыйнай асьветы. Райкомы, парторгі, бюро калектываў, ячэек абавязаны забясьпечыць цэнтры штодзённым матэрыяльным кіраўніцтвам.

Падняць ідэйна-ленінскае выкладаньне на больш высокую ступень — у гэтым адна з важнейшых задач.

Партарганізацыі транспарту павінна дабіцца поўнага разуменьня таго, што справа марксыцка-ленінскага выхаваньня новых членаў і кандыдатаў партыі зьяўляецца справай усёй партарганізацыі. Кожная партарганізацыя адказвае за становішча партасьветы ў такой-жа меры, як і за выкананьне важнейшых задач гаспадарчага будаўніцтва.

1-га ВЕРАСЬНЯ— ПАЧАЦЬ ЗАНЯТКІ

Толькі цяпер узяліся за работу

БАРЫСАЎ. Па Барысаўшчыне не праведзен яшчэ ўлік дзяцей, а таксама пераросткаў, якія падлягаюць усеагульнаму навучаньню ў 1931-32 годзе. Толькі 24 жніўня на райканферэнцыі настаўнікаў была вынесена пастанова арабіць гадкладны ўлік дзяцей. Таму новыя камплекты школ разьмеркаваны наўгад.

Дрэнна стаіць справа з будаўніцтвам школ на вёсцы. Паводле плану павінна быць пабудавана ў гэтым годзе 8 школ, але яны далёка ня ўсе будуць скончаны. Да гэтага часу ня вырашана пытаньне аб апалае і забесьпячэньні харчамі рабочых, якія працуюць на будаўніцтве школ. Гэта значна тармозіць работу.

У раёне не выкарыстоўваюцца мясцовыя рэсурсы.

У Хаўхоліцкай школе мясцовыя сродкі ад самаабкладаньня (700 руб.), якія прызначаны для рамонту школ, не скарыстаны. 22 школы па раёне ня маюць уласных памяшканьняў. Сельсаветы толькі цяпер пачынаюць наём памяшканьняў для школ.

Дрэнна стаіць справа і ў горадзе з памяшканьнямі для сярэдніх навучальных устаноў. Прафшкола электрамаш-цёраў, заналкавы тэхнікум, рабфакі — дзённы і вячэрні — ня ведаюць, дзе будуць працаваць.

Заказ на абсталяваньне для школ у арцелі сампрамгасу выкананы толькі на 50 проц.

З-за адсутнасьці разнарадкі прысланыя падручнікі да гэтага часу ляжаць у кнігарні.

Вясковыя школы ня ўсе прымацаваны да калгасаў, што стварае пагрозу зрыву палітэхнізацыі гэтых школ.

Райком КП(б)Б ня прыняў рашучых мер да арганізацыі, якія зрывалі падрыхтоўку. Толькі цяпер, калі засталося некалькі дзён да заняткаў, у раёне ўзяліся за работу.

Брыгада «Зьвязды»: Крэсін, Лавін.

Апэрацыйная зводка аб ходзе будаўніцтва і рамонту школ па 20-ці раёнах

Раёны	Школьнае будаўніцтва: Патрэба пабудаваць	Пабудавана	Не распачата будаваць	Капітальн. рамонт школ: Патрэбна рабіць рамонту	Скончан рамонт	Не распачат рамонт
Бабруйскі	12	2	2	12	3	7
Веснянковіцкі	5	2	—	3	1	—
Брагінскі	7	2	2	4	2	—
Буда-Кашалёўскі	5	1	1	8	9	—
Вялыніцкі	10	2	—	4	2	—
Веткаўскі	10	—	—	14	—	—
Гарадоцкі	8	2	1	19	9	10
Гацкі	9	2	2	9	2	6
Дубровенскі	8	—	—	6	2	1
Кармянскі	6	1	2	6	—	2
Клічаўскі	8	—	2	8	1	1
Койдановскі	10	2	—	13	—	—
Чырвонапольскі	7	—	—	15	4	11
Лоеўскі	5	1	—	20	11	3
Нараўлянскі	8	6	1	3	—	—
Пухавіцкі	4	—	—	27	9	2
Огаробінскі	13	1	1	12	2	10
Сураскі	5	1	1	11	8	1
Уваравіцкі	8	—	2	11	2	—
Чапяніцкі	2	—	—	9	1	3
Усяго	156	22	17	212	62	56

Работу падмянілі казённым цыркуляры

КАПЫЛЬ. Да пачатку навучаньня большасьць школ не падрыхтавана. Асноўная прычына непадрыхтаванасьці — ганебныя тэмпы будаўніцтва і рамонту школ. З 21 школы адрамантавана толькі 9.

З-за бязьдзейнасьці сельсаветаў школы не забясьпечаны палівам, і па гэтай жа прычыне ў Грозаўскім сельсавеце не рамантуюцца тры школы. Будаўніцтва многіх школ праходзіць нездавальняюча з-за недахвату рабочай сілы.

Капыльскі РК ЛКСМБ паслаў 11 камсамольцаў брыгадзірамі, мабілізаваў 6 камсамольцаў на расклады ЦК у падустановы і на гэтым абмежаваў свой удзел у падрыхтоўчай рабоце.

Кіраўніцтва падрыхтоўкай да навучальнага году з боку РВК выяўляецца ў тым, што апошні разаслаў цыркуляры па сельсаветах, але выкананьня іх не праверыў.

Т. Каропін.

Рэалізуем адозву ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі

Ні аднэй аборы, ні аднаго сьвінарніка— БЯЗ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ

КАЛГАС „САХА І МОЛАТ“ І САЎГАС ІМЯ СТАЛІНА ЛІКВІДАВАЛІ АБЯЗЬЛІЧКУ Ў ДОГЛЯДЗЕ ЖЫВЁЛЫ

...га ...а

...Сталіне ...ркі і са- ...чна. Вы- ...адказваў ...лю — зо- ...пастаўлены ...сельгасма- ...брыгады ...рамі. ...да кож- ...льнавод, ...ваны да ...а адказва- ...кампаніяй ...а за гэту спра- ...вінаматак. Пра- ...не двароў для ...у. Зялёны корм даец- ...ка.

...на сьвіцарніках уведзена зьдзельна-прэміяльная сыстэма аплаты працы. ...рма прыплоду павялічана да 7 пара- ...г ад кожнай сьвінаматкі.

Устаноўлены і даведзена да кожнай ...інаркі і сьвінара, што за кожнае ...ымае парасё, выгадаванае да 2-х мя- ...цаў, будзе выдавацца прэмія — 3 р., ...а кожнае загінуўшае парасё нармаль- ...а прыплоду па віне сьвінаркі будзе ...лічвацца 3 рублі з яе пэнсіі. Таксама ...ганоўлена і даведзена да ведама ўсім ...персаналу сьвінарнікаў, што за кож- ...ю свячасова пакрытую сьвінаматку ...ае выдаваецца прэмія ў 60 кап.

У саўгасе добра пастаўлена рэалізацыя прапаноў рабочых. Вывешаны ...ня абору прапаноў і дошкі ...ых. Рабочы на дошцы прапановай ...тага вы- ...ня вы- ...і якіх ...к поў- ...ьвіней ...Ужо ...ічы.

...ОВІЧ.

Укамплектаваць стада і захаваць маладняк

Прапрацаваўшы адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, калгаснікі калгасу «САХА І МОЛАТ», Махоўскага сельсавету, Магілёўскага раёну, абвясьцілі сябе ўдарнікамі па ліквідацыі прарываў у жывёлагадоўлі і ўзялі на сябе наступныя абавязкі:

Укамплектаваць стада МТФ, згодна пляну, у 100 кароў да 1 верасьня 1931 году і захаваць увесь маладняк.

Выканаць плян па сілосаваньні на 140 тон; прычым 50 проц. засілосаваць да 1 верасьня, а рэшту— да 1 кастрычніка.

Будаўніцтва аборы на 100 штук скончыць да 1 лістапада, выпучыўшы брыгаду цесьляроў з 5 чалавек.

ДЛЯ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ І ДОГЛЯДУ ЖЫВЁЛЫ ВЫЛУЧЫЦЬА ПАСТАЯННУЮ БРЫГАДУ ЖАНЧЫН З 5 АСОБ, ЗАГАДЧЫКА МТФ І 4-Х ПАСТУХОЎ, перавёўшы іх на зьдзельна-прэміяльную аплату.

Падрыхтаваць да 1932 году штучныя выпасы з кармовых траў.

У 1932 годзе перавесьці 25 проц. стада кароў на асеньні ацёл.

Стада не забясьпечана аборай і кармамі

ЛЁЗНА. Калгас «ПРАФІНТЭРН», Лёзнянскага раёну, мае ільнаводча-жывёлагадоўчы напрамак, але праўленьне калгасу пытаньнем забясьпячэньня жывёлы хлявом і кормам не займаецца.

Цэлае лета цялаты гонялася ў хлеве ў гнаі. Дойныя каровы пасуцца разам з іншымі каровамі, у выніку ўдой не перавышае 3-4 літраў малака ў суткі.

Улку жывёлы не вядзецца. Старшыня калгасу і паляводнік ня ведаюць, колькі ў іх налічваецца дробнай жывёлы.

У выніку адсутнасьці зьдзельчыны і сацыялістычных мэтадаў працы, рабочыя, якія дагледаюць стада, работай ня цікавяцца, а займаюцца свазімі асабістымі справамі. Цяляты свячэсова ня кормяцца, адсюль наглядаецца адыход. Корм, які выдаецца для калгасных сьвіней у большасьці скарыстоўваецца для корму сьвіней, якія знаходзяцца ў карыстаньні калгаснікаў, што працуюць на сьвінарніку.

Стада не забясьпечана хлявом. Есьць пагроза, што каровы зімой будуць стаяць пад адкрытым небам, аб пабудове аборы праўленьне ня думае.

Я. Асіна.

ЧЫРВОНАЙ АРМІІ— КЛЯСАВА-ВЫТРЫМАНАЕ, ПОУНАЦЭННАЕ ПАПАУНЕНЬНЕ

ВУЧЫЦЦА Ў КАМУНАРАЎЦАЎ, ЯК ТРЭБА РЫХТАВАЦЦА ДА ПРЫЗЫВУ

Пасобныя прадпрыемствы Менску добра ўсьвядомілі задачы правядзеньня прызыву. На заводзе «Камунар» па ініцыятыве камсамольскай арганізацыі праведзен сход прызыўнікаў, дзе разглядваны задачы прызыўніка. Праведзена вялікая работа па сацыяльна-клясавым адборы прызыўнікоў, 95 проц. прызыўнікоў—камсамольцы, 100 проц. —ударнікі. Праводзіцца палітычна-выхаўчая работа. У работу ўдагнаў зачклад запасу.

На менскай абутновай фабрыцы на агульных сходах рабочых абгаворваны характарыстыкі на кожнага прызыўніка. 96 проц. прызыўнікоў—камсамольцы. Да пачатку прызыву камсамольскі актыў узяў абавязак удзячыць рэшту прызыўнікоў у камсамол. Усе прызыўнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і даўно ўжо замацаваліся на прадпрыемстве да адыходу ў армію.

На пэйвэйнай фабрыцы «Настрычнік» шырока абгаворваны і складзены характарыстыкі на кожнага прызыўніка. Усе прызыўнікі—ударнікі, 84 проц. з іх прызначаны на вытворчасьці за перавыкананьне плянаў. Па пастанове фабрыкому ўсе прызыўнікі пераведзены ў першую зьмену, а пасьля працы ўсе займаюцца ў гуртках пры заводзе па павышэньні палітычнай падрыхтоўкі і ўдасканаленьні абавязкаў чырвонаармейца.

Арганізацыі гэтых заводаў сапраўды на-бальшавіцку ўзяліся за падрыхтоўку і правядзеньне прызыву, як важнай палітычнай кампаніі.

Але ёсьць і такія арганізацыі, якія бюрократычна недаацэньваюць значэньня прызыву, узяўшы стаўку на самацёк. Яны перадалі ўсю справу прызыву толькі органам ваенкамату.

Па Жытнявіцкім раёне—фармальны падыход да справы правядзеньня прызыву. Ні адзін сельсавет не правёў сацыяльна-клясавага адбору прызыўнікоў. Дырэктыва аб ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў ня выканана, няпісьменныя ня выяўлены, ніякай работы не праводзіцца.

У Кіраўлінскім раёне райкамісія не засядала да 6-га жніўня. Матэр'ялы аб прызыўніках нідзе не разглядаліся. Толькі на адным сельсавеце ёсьць 16 няпісьменных, а ніякай работы з імі не праводзіцца.

У Мсьціслаўскім раёне таксама няма масавай работы па прызыве. Ні адзін прызыўнік з няпісьменных не наведвае школы, тое самае мы маем і ў Бялыніцкім раёне.

А ў Чырвона-Слабодзкім раёне ўся справа па сацыяльна-клясавым адборы і ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў ускладзена на дэлегата райсавета стала. Савецкая грамадзкасьць стаіць у баку.

Зусім ясна, што ўсе арганізацыі паказаных раёнаў недаацэньваюць палітычнай важнасьці правядзеньня прызыву.

Да прызыву засталіся лічаныя дні. Трэба зараз-жа нагнаць пропушчанае. Перадавыя павінны ўзяць на грамадзкі буксір адсталых. Трэба наладзіць зьвяры ў Чырвоную армію сацыяльна-варожых элементам. Гэта можа быць выканана пры ўмове, калі зараз-жа безадкладна будзе разгорнута ударная напярэд масавая работа на ўсіх прадпрыемствах, у саўгасах, МТС, калгасах і з аднаасобнікамі. Трэба зараз-жа на ўсіх прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах, МТС і вёсках, дзе гэта ня зроблена, склясьці сьпісы прызыўнікоў і абгаварыць іх на вытворчых сходах.

Прызыў павінен быць праведзен на падставе шырока разгорнутага сацыяльна-спаборніцтва і ўдарніцтва паміж прадпрыемствамі, саўгасамі, МТС, калгасамі, паміж асобнымі прызыўнымі пунктамі, паміж прызыўнікамі.

СКУРАТ.

Менскія чыгуначнікі і і будаўнікі не правялі падрыхтоўкі

І на сённішні дзень цэлы рад заводаў, фабрык і а арганізацый Менску прымалі зусім невыстарчальны ўдзел у падрыхтоўцы. Камсамольскі калектыў МЦРК, напрыклад, да гэтага часу не займаецца пытаньнямі прызыву.

Слаба праходзіць падрыхтоўка і па Менскім вузлу МЕБ чыгуніі. На 23-га жніўня партыйным і камсамольскім калектывамі склікаўся сход прызыўнікоў і ўсёй моладзі, але ніхто не зьявіўся. Гэта гаворыць аб поўнай адсутнасьці работы сярод прызыўнікоў.

Сярод прызыўнікоў — шмат няпісьменных. Асабліва малапісьменнымі зьяўляюцца прызыўнікі з новабудоўлі Белдзяржбуду і Ваенведу. Кіраўніцтвы Ваенведу і Белдзяржбуду не аддавалі ніякай увагі ліквідацыі няпісьменнасьці і культрабоце сярод прызыўнікоў.

Трэба на-ходу выправіць паказаныя недахопы.

7-га верасьня па Менску пачынаецца прызыў, партыйна-камсамольскія і праф саюзныя арганізацыі Менску павінны забясьпечыць 100 проц. яўку прызыўнікоў у прызыўную камісію.

ЖУЛЕГА.

ЗАВОД ім. ЛАНЦУЦКАГА РАЗГОРТВАЕ ВЯЛІКУЮ РАБОТУ

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). Падрыхтоўка да прызыву 1909 году шырока разгорнута. Каб даць Чырвонай арміі поўнацэннае клясава-вытрыманае і палітычна-падрыхтаванае папаўненьне, кожная кандыдатура прызыўніка абгаварваецца на агульных сходах рабочых і калектыву.

Асабліва добра пастаўлена падрыхтоўка да прызыву на заводзе імя Ланцуцкага. Бюро партыйнага калектыву заводу дало канкрэтныя ўказаньні фракцыі заўкому, ячэйцы Асоавіяхіму і камсамольскай ячэйцы. Заўком сумесна з камсамольскай ячэйкай правялі шырокія рабочыя сходы на ўсіх цэхах з абгаварэньнем кандыдатур кожнага прызыўніка. Сацыяльна-чужыя элемэнты выяўлены і ня будуць дапушчаны ў армію. Быў праведзен масавы вечар прызыўніка. Сярод прызыўнікоў — 8 проц. партыйцаў і 45 проц. камсамольцаў. Каб не адрываць рабочых ад вытворчасьці, прызыў будзе праводзіцца на самым заводзе. З няпісьменнымі прызыўнікамі праводзяцца рэгулярныя заняткі. Вылучаны і пасланы работнікі ў падпэфны калгас для правядзеньня работы па прызыве.

На заводзе «Пралетары» ў кожным цэху створана камісія, якая зьбірае матэр'ялы на тых прызыўнікоў, якія зьяўляюцца з раёнаў. Такая-ж камісія працуе і на заводзе «Камінтэрн». На фабрыцы «Праца» беспартыйныя прызыўнікі ўцягваюцца ў камсамол. Усе няпісьменныя і малапісьменныя прызыўнікі прымацаваны да таварышоў, якія скончылі сямігодку.

На сельсаветах Гомельшчыны налічваецца 16 няпісьменных прызыўнікоў, якія цалкам ахопілены ліквпунктамі.

Сход гомельскіх прызыўнікоў, які нядаўна адбыўся падвёў вынікі сацспаборніцтву паміж Менскім і Рэчыцай. Усе прызыўнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і замацаваліся на прадпрыемствах да адыходу ў армію. Многія падалі заявы аб прыёме ў камсамол. Усе прызыўнікі пастанавілі арганізаваць варашыляўскі суботнік па ўборцы ўраджаю.

Работа па аздараўленчай кампаніі сярод прызыўнікоў адстае. Інспэктура аховы здароўя і ячэйкі Чырвонага Крыжу стаіць у баку ад прызыву.

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

ПРЫЗЫЎ—ПА-ЗА ЎВАГОЮ

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу. Наш кар.). Сацыяльна-клясавы адбор прызыўнікоў у асноўным закончен. Праведзены канфэрэнцыі прызыўнікоў па сельсаветах і ў горадзе на прадпрыемствах.

Трэба адзначыць, што грамадзкасьць акол падрыхтоўкі да прызыву не мабілізавана, уся работа ўскладзена на ваенкамат, які не атрымлівае ў сваёй рабоце належнай дапамогі. Райпрафсавет дагэтуль не абгаварваў пытаньня аб прызыве. Праверкі і дапамогі ў рабоце па прызыве на месцах ня было.

Камсамол прымае слабы ўдзел у кампаніі прызыву. Калі ў першых пічбах жніўня райком камсамолу выпучыў брыгады на ўборачную кампанію, то ніякіх дырэктыў аб падрыхтоўцы да прызыву гэтым брыгадам не давалася. Сакратары камсамольскіх ячэек камбінату і торфазаводу нават ня ведаюць, колькі у іх прызыўнікоў.

МАГІДАЎ.

АРГАНІЗАВАЦЬ СУСТРЭЧУ НОВЫХ РАБОЧЫХ

Новым рабочым НЯ СТВОРАНЫ СПРЫЯЮЧЫЯ УМОВЫ на Бабруйскім камбінаце

Адміністрацыя Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату недаацэньвае важнасьці ўтварэньня спрыяючых умоў для ўпоў прыбываючых кадраў рабочых. Новыя рабочыя не забясьпечаны ў выстарчальнай меры жыльлём, слабе культурна-бытавое абслугоўваньне. Пабудова новых баракаў ідзе надзвычай марудна. У пабудаваных інтэрнатах (старых толькі 2) пануе бруд, адсутнічае гатаваная вада. Інтэрнаты зусім не агледжаны, не ацяпляюцца, стрэхі цякуць. Адміністрацыя не клапоціцца аб рамонце іх.

Ніякай культурна-масавай работы сярод новых рабочых не праводзіцца. Ленкутох у бараку № 2 заняты прыватнымі жыхарамі. Цэхкомы, якія вылучаны для правядзеньня работы ў інтэрнатах, яе не праводзяць.

Заўком і партком павінны зьвярнуць увагу на становішча інтэрнатаў і культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых.

С. Дальні.

За арганізаваны, а не самавольны адыход

Калгас «Сацыялістычная бацькаўшчына» (Лёзнянскі раён) пры правільнай арганізацыі працы мог бы вылучыць адпаведную колькасьць адыходнікаў. Але нераспарадчасьць кіраўніцтва зусім не дае права ўходу калгаснікаў у адыход. Між тым за апошні час назіраецца самавольны ўход 23 ч. на прадпрыемствы. Гэта нездаровае зьявішча павінна быць неадкладна зьнішчана. Адыходніцтва павінна быць арганізавана выходзячы з магчымасьцяй калгасу, з улікам наяўнасьці тэй ці іншай кваліфікацыі калгаснікаў і г. д. Усякі самавольны ўход без дазволу праўленьня па сутнасьці дэзарганізуе, зрывае работу калгасу. Супроць гэтага трэба весьці самую рашучую барацьбу.

П. Хадарэнка.
А. Прудзячэнка.

Унядрыць жаночую працу ў вытворчасьць ШЫРЭЙ СЕТКУ ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ

У справе зьмяцчэньня недахвату рабочай сілы на прадпрыемствах вялікае значэньне мае выкарыстаньне жаночай працы. У гэтай галіне выключную кампанію набывае арганізацыя дзіцячых яслей і дзіцячых садоў. Віцебская жыльлёвая кампэрацыя правяла значную работу па вызваленьні хатніх гаспадынь ад догляду дзяцей, абхапіўшы тысячы дзяцей дзіцячымі ўстановамі. Кожны жакт мае па адным дзіцячым садзе. Гэта дало магчымасьць уцягнуць у прадпрыемствы каля 40 проц. хатніх гаспадынь. Аднак трэба адзначыць, што камчастка Гарсавету не садзейнічае жактам у іх рабоце па разгортваньні сеткі дзіцячых устаноў. Быў выпадак калі камчастка прапанавала аслабаніць памяшканьне дзіцячага саду «Чырвоная Зорка» для паліклінікі, прадаставіўшы ў замен гэтага памяшканьне каля самага Полацкага рынку, дзе няма ні двара, ні зелені. Жакт быў прымушан выдаткаваць больш 3 тыс. рублёў для рамонту другога памяшканьня адпаведнага дзіцячаму саду. Як высьвятлілася, былое памяшканьне дзіцячага саду доўгі час пуставала і толькі зараз заняла пад магазы.

Ведзячы.

Цякучасьць новых кадраў рабочых дасягае 25 проц.

БАБРУЙСК, 23. (БЕЛТА). Райкалгассаюз зрывае забясьпячэньне дрэваапрацоўчага камбінату і торфазаводу «Новая Беларусь» рабочай сілай. За даньне на вярбоўку рабочай сілы ў калгасах для камбінату, ня гледзячы на скапчэньне вызначанага тэрміну, на 18 жніўня выканана ўсяго на 30 проц. Райкалгассаюз зусім ня ведае, як выканана заданьне на вярбоўцы рабочай сілы для торфазаводу.

Новыя рабочыя, завербаваныя камбінатам, дрэнна забясьпечваюцца агульнымі памяшканьнямі, пасьцельнымі прыладамі. Культмасавая работа праводзіцца зусім слаба, у выніку чаго ёсьць вялікая цякучасьць сярод новых завербаваных рабочых, даходзячы да 25 проц.

Такія выпадкі ўходу новых рабочых ёсьць і па торфазаводзе «Новая Беларусь».

АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ СЕМ'ЯЎ ВАЙСКОВАСЛУЖАЧЫХ ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК І СНК СССР

МАСКВА, 23. Прэзыдыум ЦВК і Саўнарыскам Саюзу прынялі пастанову аб забесьпячэньні сем'яў вайсковаслужачых. Непрацаздольныя браты, сёстры, жонкі і бацькі вайсковаслужачых радзіны і малодшага кармільца складу, якія адбываюць тэрміновую (бесьперапынную) службу ў радах РСЧА і служаць у пераменным складзе тэрытарыяльных часьцяў РСЧА, маюць права на дзяржаўнае забесьпячэньне ў наступных выпадках: калі ў РСЧА заклікан адзіны працаздольны член сем'і, пры адным ці больш непрацаздольных членах сем'і, якіх ён да прызыву ўтрымліваў сваёй працай; калі, апрача закліканага ў РСЧА, ёсьць другі працаздольны член сем'і і працай абодных да прызыву ўтрымліваліся трое ці больш непрацаздольных членаў сем'і (да сем'яў, закліканых у РСЧА прыраўніваюцца і сем'і, якія паступаюць у РСЧА ў добраахвотным парадку).

ПАЛЯВАЯ ШТОДЗЕНКА— БАЯВОЕ ЗЬВЯНО БАЛЬШАВІЦКАГА ДРУКУ

У КОЖНЫ САЎГАС, КАЛГАС МТС— ШТОДЗЕННУЮ ПАЛЯВУЮ ГАЗЭТУ

„Неабходна самым шырокім чынам разгарнуць выданьне ў калгасах і саўгасах палявых паходных газэт“

(З ПАСТАНОВЫ ЗЬЕЗДУ)

ВОПЫТ

выданьня палявых газэт у калгасах Асьвейшчыны

Даручэньнем рэдакцыі «Беларускай работніцы і сялянкі» было: у ільна-ўборачнай арганізаваць палявыя газэты ў калгасах Асьвейскага р-ну, і прыцягнуць да гэтай справы калгасніц.

Разам з РК партыі і рэдакцыяй раённай газэты на гэту работу мы мабілізавалі 4-х партыйцаў і камсамольцаў. Пачалі з рейда. Стварыўшы 3 брыгады (у якіх увайшлі некаторыя з арганізатараў палявых газэт) мы праперылі гатоўнасьць да ільна-ўборкі 4-х раённых арганізацый МТС, Калгассаюз, Райза і Лёнкаансаюз, Рейд выкрыў, што арганізацыі і да ўборкі не падрыхтаваны, яны апартуністычна не даацэньваюць ручную ільнаўборку. Вынікі рейду вызьніліся матар'ялам для інструктаваньня арганізатараў палявых газэт якіх зараз-жа кінулі ў калгасы: «Карла Маркса», «Колас Калініна» «Авангард» і «Новы шлях»

У большасьці з названых калгасаў навыцешаюцца дагэтуль ня існавала. Таму, ня толькі палявая газэта а наогул калгасны друк для масы калгаснікаў, а тым больш для калгасніц, зьявіўся навіною.

У некаторых калгасах мэты палявой газэты папярэдня абгаварылі на сходах. Стварылі рэдкалегіі (з 5-7 асоб). Палявая газэта выходзіла штодня раніцой. У большасьці, сталага месца для яе ня было. Памяшчалі газэту там, дзе сёньня працуе больш людзей: у полі каля жняваркі, каля малатарні, у таку, побач з вы вешанымі нарадамі і г. д.

ВЯРБОЎКА АКТЫВУ.

З пачатку матар'ялаў у газэту ніхто не даваў. Таму, першыя нару дзён рэдкалегія, акрамя арганізацыі і рэдагаваньня, выконвала ролю вышукваньня матар'ялаў. Сябраў рэдкалегіі прымацоўвалі да асноўных галін гаспадаркі. У гутарках з брыгадамі і лепшымі ўдарнікамі яны знаходзілі матар'ял для першых нумароў. Былі выпадкі, калі некаторыя калгаснікі і нават брыгадзіры адмаўляліся падаць факты сябру рэдкалегіі, кажучы: «калі для газэткі — нічога не скажу, бо мне пасьля не дадуць праходу».

З выхадам першых нумароў «байкот» быў зломаны, у рэдкалегію цэлымі пачкамі падавалі матар'ялы. Яшчэ часьцей на аднаму і нават групамі калгаснікі вылузліся да сяброў рэдкалегіі прасілі «прадзіраць у газэтку». У калгас імя Карла Маркса на досьвітку ў рэдкалегію зьявілася цэлая дэлегацыя пастухоў з скаргай на прагульшчыцу Штэйн. Найчасьцей матар'ял давалі на словах. За выключэньнем асобных выпадкаў пададзеныя факты адпавядалі сапраўднасьці, але ўсё-ж кожны аўтар прасіў у газэты яго сапраўднага імя не надпісваць.

ЗЬМЕСТ МАТАР'ЯЛАЎ.

Зьмест пераважнай большасьці допісаў — здаровая гаспадарчая крытыка недахопаў у паасобных галінах гаспадаркі. У «Новым шляху» сельскі заўважылі, што працуючыя на касіцы позна выходзяць на работу і безгаспадарча адносяцца да машын. У калгасе імя Карла Маркса, выкрылі што ў калгасным мыльне — п'ююць, якія прыводзіць да псаваньня рухавіка. За «магарычы» мельнік выслухоўваецца перад адпаасобнікам. Жыта з млыну пападае на прыватны рынак і г. д.

Выкрываўчага зьместу паступала пераважная большасьць матар'ялаў. Гэта даводзіць здаровае імкненьне калгаснікаў праз газэту, выносіць недахопы пад абстрол грамадзкасьці.

Адначасова зьмест матар'ялаў паказаў і некаторыя нездаровыя тэндэнцыі.

Былі спробы выкарыстаць палявую газэту для таго, каб сваю віну перакласьці на не вінаватага. Прыклад: Калесьнік Сяргей (калгас імя Карла Маркса) просіць рэдкалегію «прабраць» загадчыка інвэнтаром Марачкоўскага, які не зьявіўся на сваё месца. Калесьнік не атрымаў хамута і г. д. та прымусіла яго прагуляць больш за тры гадзіны. Да заявы рэдкалегіі падышла крытычна. Праверыўшы факт мы ўстанавілі, што вінават сам Калесьнік, які выбраўся на работу пасьля таго, як загадчык выдаў інвэнтар і сам пашоў касіць. Газэта зьмясьціла ня факт паданы Калесьнікам, а вынікі праверкі яго, даўшы лёзунг: «Хто позна на работу выходзіць, той усяму калгасу шкодзіць».

Другое — адмоўная спроба — засыпаць газэту бытавымі дробязямі, якія на кшталт грамадзкай каштоўнасьці (узаемаадносіны між хлапцом і дзяўчынкай і г. д.).

Абавязкова забясьпечыць парткіраўніцтва газэтамі. У склад рэдкалегіі трэба падбіраць вытрыманых калгаснікаў, ставячы ўсю рэдкалегію, якая-б адмяла спробу клясавага ворага і прагульшчыка выкарыстаць газэту і забясьпечыла выканаваньне газэтай сваёй адказнай палітычнай ролі. Палявая газэта ні ў якім разе не павінна заплываць дробязямі, яна павінна змагацца за прынцыповыя пытаньні, якія маюць грамадзкае значэньне ў межах калгасу і далей.

РЭАГАВАНЬНЕ НА ГАЗЭТУ

Некаторыя допісы палявой газэты перададзены на расьсьледаваньне ў вышэйшыя арганізацыі.

Кожны факт, ці імя памянёнае ў газэце, кулаю абвяшчала ўвесь калгас. На кожны допіс адрэзу-ж рэагавалі. Як пра-

Пастановы рабселькораўскага зьезду—выконваем

26 ліпеня на агульна-камсамольскім сходзе калгасу «ЗЬВЯЗДА» камсамольцы разам з беспартыйнымі калгаснікамі абгаварылі вынікі 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў. На сходзе ярыкалі пастанову выпускаць штодзённую насьценгазэту. Усе камсамольцы, а таксама і беспартыйныя калгаснікі тут-жа на сходзе аб'явілі сябе ўдарнікамі. На гэтым-жа сходзе абралі рэдкалегію з 5-ці чалавек.

Зараз газэта ў калгасе стала лепшым памочнікам у рабоце калгасу і кожнага калгасніка.

З ,ПАДОЛЬСКІ.

віле, на крытыку адказвалі здаровым рэагаваньнем. Наводле прапановы газэты ў той-жа самы дзень прыводзіліся ў парадак сельгасмашыны, адстаючая брыгада раўнялася на ўдарную. У калгасе імя Карла Маркса кульгала справаздачнасьць (ясьляй перад бацькамі і мэдыцынскі нагляд. Па прапанове газэты загадчыца ясьляй рыхтуе справаздачу на першы жаночы сход, умаўляецца з дактарам аб нагляде за дзецьмі і аб чытальні лекцый мацерам. Скарачаюцца прагулы, узрастае вытворчасьць працы. Калесьнік Сергей папаў за прагул на чорную дошку. На другі дзень досьвітках бацька будзіць яго, каб не спазьніўся на працу.

Але мы бачылі і другія адносіны да газэты. Кулацкія агенты, рвачы, прагульшчыкі, п'яніцы, з чорнага сьпісу палявой газэты, пачалі грунавацца. З боку іх быў вялікі націск на рэдкалегію, каб выведаць імя селькора. З боку іх былі нават пагрозы рэдкалегіі: «таго, хто піша газэты, трэба з-за вугла цэглінай пачаставаць, каб не баламуціў людзей». У калгасе імя Карла Маркса быў выпадак, калі «пакрыўджаныя» газэтай нацкавалі на сябра рэдкалегіі брыгаду калгаснік, з патрабаваньнем: «прыкрыйце газэту», (гаі-ж брыгада да вечара зразумела і прызнала сваю памылку). Патрабаваньнем прагульшчыкаў, зрыўшчыкаў зьдзельшчыны было: «выкажы на словах, але ў газэту ня пішы».

Усё гэта шчэ раз сьведчыць, што палявая газэта, як частка ўсяго нашага друку, вастрэйшая зброя партыі. Палявая газэта найбольш балюча ўдарыла па кулацкім агенту, прагульшчыку, рвачу, зрыўшчыку мерапрыемстваў партыі і савецкай улады. Таму гэта зграя пачала грунавацца, каб пагрозамі і пакаваньнем перашкодзіць рабоце газэты. Аднак асноўная маса калгаснікаў гэтай зграі да ла руйнуючы бой. Некаторыя брыгады адмовіліся прымаць у свой склад гультаёў. Ад груп п'яніц, (напаўных у чорны сьпіс) адышла значная частка лепшых калгаснікаў, парваўшых з п'яніцамі ўсякае сяброўства. З кожным днём у рэдкалегіі ўзрастала колькасьць матар'ялаў. Паступіла рад прапаноў, каб газэта засталася сталай, а ня толькі на час уборачнай. Рэдкалегія паклапацілася набыць макеты, на якіх выходзілі палёўкі. Усе рэдкалегіі ўзяліся выпускаць газэту падалей (праўда, ня штодзенна, а раз у 3-5 дзён), з тым, каб пасьля палявых работ нератварыць яе ў апэрацыйную насьценгазэту.

ЧАГО ДАБІЛАСЯ ГАЗЭТА.

Вязьлітасна б'ючы падрыўшчыкаў работы, палявая газэта з самага пачатку паказавала прыклады ўдарнай работы цэлых брыгад і асобных ударнікаў. У калгасе імя Карла Маркса пад ільном 136 га. Каб сарваць ільнаўборку кулацкія агенты агітуюць супроць выхаду на поле жанчын, супроць бальшавіцкіх тэмпаў уборкі. Трэба было зламаць гэта супраціўленьне. Паказаўшы вынікі ўдарнай працы, газэта дае лёзунг: «ні каліва ільну на полі. Сацспаборніцтвам брыгад забясьпечым перамогу ў ільнаўборцы». Газэта папулярызуе пастановы вытворчай нарады на гэтым пытаньні.

Каб забясьпечыць посьпехі ільнаўборкі, неабходна мабілізаваць на гэту справу ўвагу ўсёй масы калгаснікаў. Таму, дамовіўшыся з парт'ячэйкай, мы ставім пытаньне аб ільнаўборцы на агульным сходзе ўсяго калгасу (калгас аб'ядноўвае 175 гаспадарак).

Кулацкія агенты вялі падрыхтоўку да зрыву гэтага сходу. Пад кулацкім уплывам калгасніца Піснуніха (нядаўна ўступіла ў Каханавіцкае аддзяленьне калгасу) папярэдня арганізавала цэлы «мітынг», на якім агітавала калгаснік за разбазарваньне кармоў, супроць ударнай работы, супроць калгасу. Ёй дапамагаў Краснашчскаў.

Але на сходзе выкрылі клясавыя карэньні гэтай агітацыі. Калгас імя Карла Маркса абвясьціў сябе ўдарным па ільнаўборцы і выклікаў на сацспаборніцтва суседні буйны калгас «Колас Калініна». Усю плошчу ільну калгас імя Карла Маркса разьбіваў на вучасткі. Для ўборкі ва кожным вучастках замацоўвае брыгады. Лепшай брыгадзе вызначана премія ў 100 рублёў. На час ільнаўборкі ва ўсіх раёнах, аб'яднаных калгасам, арганізуюцца прымітыўныя двіцячыя ясьлі.

«Карла Марксаўцы» зьвярнуліся з адозвай да ўсіх калгасаў ВСОР у раёнах будаўніцтва ільнаазводаў, каб пасылкай коняй і людзей скараціць тэрміны будаўніцтва ільна-заводаў.

У наступны дзень палявая газэта вышла ў чатырох экз. Паказаўшы супраціўленьне клясавага ворага сацспаборніцтву, газэта мабілізавала калгаснікаў на ўдарную работу. Экземпляр гэтай газэты пасланы ў кожнае аддзяленьне калгасу.

Трэба распаўсюджваць вопыт палявых газэт. Палявыя газэты — баявое зьвяно бальшавіцкага друку. Яны гуртуюць вакол сябе актыў калгаснікаў, лепшых ударнікаў. Даючы адпор кулаку і яго агенту — апартуністу, палявыя газэты арганізуюць масы для перамог па сацыялістычным будаўніцтве.

В. Хмялеўская.

Селькор-ударнік на ўборцы

Ударыць па апартуністах, якія недаацэньваюць нізавы друк

У ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІМ РАЁНЕ пастановы 2-га Ўсебеларускага зьезду рабсельвеенкораў не распрацоўваюцца. Пастанова зьезду «пры кожным калгасе абавязкова арганізаваць насьценгазэту» ня выконваецца. У большасьці калгасаў гэтага раёну на час уборкі газэты ня выпушчаны.

Калі ў калгасе «МАЙСКІ ПРАМЕНЬ» на час уборкі пры дапамозе студэнцтва рэдкалегіяй была выпушчана насьценгазэта, якая зробакова адлюстравала дадатныя і адмоўныя бакі калгасу і зьявілася арганізатарам уборкі ў калгасе, дык на куставым партыйным сходзе старшыня рабачкому Танежыцкай МТС тав. ВАСІЛЕНКА заявіў, «ШТО З НАСЬ ЦЕНГАЗЭТАМІ Ў КАЛГАСАХ ДАЛЁКА НЕ ЗАЕДЗЕШ, ЛЕПШ-БЫ ГЭТЫ ПАТРАЧАНЫ ЧАС НА ВЫПУСК ГАЗЭТЫ СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ ЎБОРКІ».

Такую апартуністычную думку падтрымаў у сваім заключным слове і САКРАТАР ЧЫРВОНА - СЛАБОДЗКАГА РК КП(б)Б ТАВ. КРАЦАР.

У выніку такой апартуністычнай «тэорыйнай» зусім адсутнічае работа з рабселькорамі. Раённая газэта «КАЛГАСЬНІК» таксама не дапамагае разгортваньню рабселькораўскага руху і нізавога друку. Рабселькораўскі рух па раёне ідзе самацёкам.

АЛЕСЬ СЯЧКО.

„УДАРНІК УБОРАЧНАЙ“— АРГАНІЗАТАР КАЛГАСНЫХ МАС

Зараз-жа пасьля другога Ўсебеларускага зьезду, рабселькоры Ельшчыны, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, па-ўдарнаму ўзяліся за рэалізацыю пастаноў зьезду. На першай раённай рабселькораўскай нарадзе, якая адбылася 17-га ліпеня, была пастаўлена канкрэтная задача аб карэннай перабудове рабселькораўскага руху ў раёне згодна пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і Ўсебеларускага зьезду рабсельвеенкораў.

З ліку актывістаў РКК-РСІ і камсамольцаў было створана 5 ударных брыгад, якія накіраваліся па сельсаветах для правядзеньня прапрецоўкі рабсельвеенкораўскага зьезду і арганізацыі палявых штодзённых калгасных газэт «Ударнік уборачнай». На вёску выехалі таксама па гэтым пытаньні і брыгады студэнтаў, якія ў той час знаходзіліся ў раёне. Разгарнулася масавая работа.

Пачынаньне па выпуску палявой газэты было зроблена ў САНЮКОЎСКІМ сельсавеце калгасам «ЭНЭРГІЯ», дзе першы нумар быў выпушчан 18-га ліпеня. Газэта з самага пачатку праявіла сябе, як арганізатар калгасных мас на пасьляховае правядзеньне ўборкі і, само сабою зразумела, ня прышлася па нутры кулаком і падкулачнікам. Апошнія на другі-ж дзень сталі агітаваць супроць выданьня газэты. Пад кулацкі уплыў падпаў палявод гэтага калгасу тав. Дубніцкі, які прыбег у рэдкалегію штодзённі і прасіў: «Паніньце, браткі, гэтыя газэты, бо ў калгасе хвалююцца, цэлая калгасная рэвалюцыя». Пасьля правядзеньня Санюкоўскай партыйнай і камсамольскай ячэйкамі адпаведнай работы і растлумачэньня калгаснікам сутнасьці кулацкай агітацыі, у рэдкалегію «Ударніка ўборачнай» пачаў масамі паступаць матар'ял. Газэта змагалася за зьдзельшчыну і ліквідацыю абязьлічкі, за арганізацыю новых ударных брыгад. «Ударнік уборачнай», які пачаў выходзіць па ўсіх калгасах Сінюкоўскага сельсавету, заваяваў ВЯЛІКІ АЎТАРЫТЭТ сярод калгаснікаў.

20-га ліпеня пачала выходзіць палявая газэта ў калгасе «Чырвоны трактар», Скараднянскага сельсавету. Тут газэта асабліва добра змагалася за ўдарную работу ўборачных машын. На старонках яе быў паказан лепшы калгаснік-ударнік тав. Дэйер, які на працягу ўсёй уборачнай кампаніі замест 3 гэкт. убіраў жнівяркай па 5 гэкт. у дзень, значна перавыконваючы, такім чынам, сваю норму. У другім нумары палявой газэты гэтага калгасу быў зьмешчан матар'ял з патрабаваньнем поўнага пераводу ўсіх работ на зьдзельшчыну, правільнай расстаноўкі сіл і акуратнага вядзеньня запісу работы ў кніжках калгаснікаў. У трэцім нумары быў зроблен упор на ліквідацыю абязьлічкі ў калгасе. Палявая газэта ў гэтым калгасе, як сказаў калгаснік Кабылінскі, «зьявілася першым памочнікам праўленьня і лепшым арганізатарам мас».

Трохі пазьней пачала выходзіць штодзенка ў калгасе «Бальшавік», Рамязоўскага сельсавету. Спачатку пасланыя туды макеты палявых газэт ляжалі ў шафе канцылярыі калгасу некранутымі. Праўленьне калгасу, як відаць, баялася выданьня гэтай газэты. Толькі пасьля прыезду з раёну брыгады было арганізавана там выданьне штодзенкі. Разгарнуўшы работу сярод калгаснікаў, «Ударнік уборачнай» выявіў групу кулакоў і антысавецкага элемэнту, якая прапесла у калгас і імкнулася сарваць пасьляховае правядзеньне ўборкі. Праўленьне калгасу падпала пад іх уплыў і спазьнялася з уборкай сенажаці. На 16-га жніўня ў калгасе знаходзіліся пад дажджом скошаныя 40 гэкт. сенажаці, а тэксама заставалася яшчэ шмат нескошанага. У калгасе існавала поўная абязьлічка, работа праходзіла самацёкам. Пра сацспаборніцтва і ўдарніцтва і чуваць ня было. Газэта выкрыла ўсе гэтыя непаладкі і рашуча ўдарыла па апартуністычнай практыцы праўленьня калгасу. Прачытаўшы палявую газэту, калгаснікі патрабавалі ачысьціць калгас ад кулацкага элемэнту, што і было зроблена пры ўдзеле прадстаўніка РК партыі.

ЗАРАЗ У 60 КАЛГАСАХ ЕЛЬСКАГА РАЁНУ ВЫХОДЗЯЦЬ ПАЛЯВЫЯ ШТОДЗЕННІ, ЯКІЯ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РК КП(б)Б І ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК АРГАНІЗАВАЛІ Ў КАЛГАСАХ ЗА ЧАС СВАЁЙ ПРАЦЫ ЗВЫШ 200 УДАРНЫХ БРЫГАД.

У сьвятле гэтых даволі значных посьпехаў трэба адзначыць, што рад партыйных ячэек, напрыклад, РАМІЗОЎСКАЯ, ВЫСОЦКАЯ І КУЗЬМІЦКАЯ, яшчэ не ўзяліся па-баявому за рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху. Адстаючых не павінна быць. Уся раённая партыйная арганізацыя, па прыкладзе перадавых ячэек, павінна рашуча ўзяцца за самае шырокае разгортваньне рабселькораўскага руху і нізавога друку, выконваючы гэтым самым адну з адказнейшых партыйных задач.

ЕЛЬСКІ РК КП(б)Б.

НА АВАНПОСТАХ БАРАЦЬБА ЗА УБОРКУ УРАДЖАЮ ЗЯБЛІВА І АСЕНЬНЮЮ СЯУБУ— ПУЦЕУКА ШТОДЗЕНАК

За тыдзень працы брыгады газэты «Рабселькор» у Койданаўскім раёне разгарнуўся па калгасах масавы выпуск палявых штодзённак. «Ударнік уборачнай. Газэты акуратна выпускаюцца больш чым у 20 калгасах раёну, у сапраўднасьці іх больш, бо ня ўсе рэдкалегіі паведамілі аб выхадзе газэт.

Брыгада пачала працу з стварэньня грамадзкае думкі вакол штодзённак у кіруючых раённых арганізацыях. У першую чаргу за выпуск штодзённак узяўся камсамол. Пленум райкому 14 жніўня дэталёва абгаварыў пытаньне аб выпуску штодзённак і «абавязаў кожную калгасную ячэйку ЛКСМ арганізаваць і выпускаць баявую штодзённую газэту «Ударнік уборачнай». Камсамольцы горача ўзяліся за гэтую справу, пачалі выпускаць штодзённі і арганізоўваць вакол іх масы калгаснікаў на хутчэйшае сканчэньне ўборкі, сіласаваньня і пачатку асеньняй сяўбы.

Ужо зараз можна прывесьці шмат прыкладаў і канкрэтных дасягненьняў штодзённак па паасобных калгасах.

Жывёлагадоўчы калгас імя Мархлеўскага да 14 жніўня зусім не распачынаў сіласаваньня. Першы-ж непагадлівы дзень штодзённка скарыстоўвае для арганізацыі нядзельніка за які засіласавалі 10 тон, пасьля гэтага калгас пачаў штодзённа сіласаваньне. Адначасова па ініцыятыве газэты ліквідуецца абязьлічка ля сіласарэзкі, якая раней прывяла яе да поўнага псаваньня.

У тым-жа калгасе штодзённка разам з падняцьцем тэмпаў уборкі збожжа арганізоўвае малацьбу і здачу хлеба. 16 жніўня накіроўваецца 24 цэнтнэры збожжа, чырвоным абозам на станцыю.

З выхадам першых нумароў штодзённкі вакол яе групуецца актыў сельскораў-ударнікаў, на сход сельскораў прыходзіць 45 калгаснікаў, якіх зацікавіла праца газэты. Лепшы ўдарнік калгасу Тамашэўскі, 65 гадовы старык, якога газэта запісала на чырвоную дошку становіцца актыўным сельскорам і кажа прыйшоўшы на сход: «Хоць я стары і пісаць магу дрэнна, але кожны прыклад добрай і дрэннай працы буду паведамляць нашай газэце».

Вялікую працу правяла штодзённка ў калгасе «Новае жыцьцё». Выхад яе саўпаў з прарывам у сенаўборцы: на 14 жніўня стаяла нескошаным 18 гэкт. сенажаці. Газэта аб'явіла штурм прарыву, патрабавала ад праўленьня калгасу кінуць на сенаўборку лепшую брыгаду калгаснікаў. Гэта было зроблена і 18 гэкт. былі скошаны на працягу 2-х дзён, як і патрабавала штодзённка. Адначасова штодзённка пераключаецца на арганізацыю абмалоту і здачы хлеба, арганізоўвае чырвоны абоз на збожжа дзяржаве.

Калі спынілася малацьба за адсутнасьцю трактарнага масла, газэта дабілася хуткай дастаўкі яго з раёну. Малацьба ня спынілася і брыгада трактарыстаў вымясла падзяку штодзённцы за дапамогу.

З энтузіязмам сустрэлі выпуск штодзённкі калгаснікі калгасу імя Тэльмана. Тэльманаўцы першыя ў раёне скончылі ўборку азімых і першыя-ж пачалі здаваць збожжа дзяржаве. Але-ж налядаліся дрэнныя зьявішчы ў брыгадах, як п'яніка, прагулы і г. д. Гэта тармазіла працу астатніх калгаснікаў. Першыя-ж нумары штодзённка прысьвячае барацьбе за лепшую брыгаду па ворыве зяблівы, абмалоту, за лепшую дарку. Заносеныя на чорную дошку зрыўшчыкі ўдарнае працы пачынаюць падцягвацца. Шумановіч Алесь, які раней часта прагульваў, нядбайна адносіўся да гаспадаркі, пасьля ўзьдзейнічаньня на яго праз штодзённку робіцца прыкладным калгаснікам і за час малацьбы ня робіць піводнага прагулу.

У гэтым жа калгасе газэта шмат зрабіла ў справе ўкамплектаваньня стада, яна дабілася правядзеньня ў жыцьцё пастановы агульнага сходу аб продажы калгаснікамі жывёлы ў арганізаванае стада. Паасобныя калгаснікі ўжо прадаюць кынёлу калгасу. Адначасова штодзённка бярэ пад нагляд будаўніцтва каровнікаў, дабіваецца высокіх тэмпаў у будаўніцтве і пабудова іх будзе скончана не пазней 1-га верасьня, раней чым мяркавалася па плану.

Адначасова штодзённкі праводзяць праца па перабудове кіраўніцтва рабселькорамі па новаму, згодна рашэньня II-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў па мэтадзе канкрэтнага кіраўніцтва па прафесіях. Некаторыя штодзённкі (калгас імя Мархлеўскага, «Новае жыцьцё»), былі праведзены нарады сель кораў-мапацьбітоў сумесна з астатнімі калгаснікамі, працуючымі ля малатарні. Праводзяцца рэйды, да якіх прыцягваюцца радавыя калгаснікі. Гэтым была дасягнута лепшая эфэктыўнасьць дзейнасьці зьмяшчаемага матар'ялу. Рэдкалегія штодзённкі калгасу імя Мархлеўскага практыкуе досыць удалы вопыт выпуску цэлых нумароў газэты прысьвечаных адному пытаньню. Так, перад нядзельнікам сіласаваньня выпускаецца нумар пад назвай «Ударнік сіласу» у якім ставяцца ўсе пытаньні аб наладжаньні сіласаваньня ў калгасе.

На некаторых калгасах штодзённкі выпускаюцца ў 2-3 экзэмплярах і вывешваюцца ў розных месцах працы калгаснікаў, а ў калгасе «Новае жыцьцё» кожнае з 3-х аддзяленьняў выпускае асобную газэту па пытаньнях працы свайго аддзяленьня.

Мы ўзялі ўзорныя прыклады працы штодзённак. Бязумоўна, што далека ня ў кожным калгасе зараз яны выходзяць і далёка ня ўсе добра змагаюцца на фронце ўборкі і падыходзячай сяўбы. Партыйным і камсамольскім ячэйкам неабходна ўзяць пад сваё кіраўніцтва ўсю працу штодзённак. Толькі пры гэтай умове вынікі іх працы змогуць сапраўды адпавядаць тым патрабаваньням, якія высунулі перад нізавым калгасным друкам рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б і II-гі Усебеларускі зьезд рабсельвеенкораў.

Бялько, Эйдліна, Герцман.

ШТОДЗЕНКІ НА ПАЛЕХ УБОРАЧНАЙ

В. ВЕРЖБАЛОВІЧ

Запрашаючы украінскіх рабселькораў прыехаць на наш Усебеларускі зьезд, мы асабліва прасілі іх падрыхтаваць да самай падрабязнай перадачы вопыту Украіны на выданьні штодзённых, цахавых і калгасных (палявых газэт. Наша просьба была выканана. У адным з абедзеных перапынкаў сэкцыйнай работы зьезду, «Рабселькор» сумесна з украінскай дэлегацыяй правёў дзве спэцыяльныя нарады — адну з дэлегатамі-рабкорамі, другую — з селькорамі, на якіх рабкорка Харкаўскага заводу «Серп і Молот» (на гэтым заводзе стала выходзіць першае ў СССР цахавая штодзённка «Вагранка») тав. Неваляінская і селькор Нова-Украінскага раёну тав. Мануйленка падрабязна перадалі вопыт работы штодзённак. Гэтыя нарады прайшлі вельмі жыва. Дакладчыкаў засыпалі дзесяткамі пытаньняў. Дэлегаты цьвёрда ўцямілі, якую вялізарную ролю адыгрываюць выданьне апэрацыйнай штодзённай газэты. У выніку, дэлегаты ўзялі на сябе абавязацельства па прыезьдзе на месцы неадкладна разгарнуць работу на выданьні штодзённак. Рэдакцыя газэты «Рабселькор» са свайго боку абяцала забясьпечыць кіраўніцтва і максымальную дапамогу і перш за ўсё выданьнем спэцыяльных макетаў. У канцы работы зьезду, выконваючы сваё абяцаньне, «Рабселькор» ужо забясьпечыў усіх дэлегатаў-селькораў пачкамі макетаў штодзённі «Ударнік уборачнай».

Асаблівую апэрацыйнасьць у арганізацыі палявых штодзённак пасьля зьезду правялі дэлегаты Ельскага раёну. Не прайшло і пяці дзён пасьля зьезду, як селькоры Ельскага раёну пад кіраўніцтвам раённых партыйных арганізацый разгарнулі вялікую работу па арганізацыі палявых штодзённак. Не разьлічваючы на самацёк, ельскія таварышы, арганізавалі 5 ударных брыгад і паслалі іх на калгасах і саўгасах для арганізацыі палявых газэт «Ударнікам уборачнай». У выніку, за параўнаўча кароткі час, было арганізавана па раёне 60 штодзённых палявых газэт.

Усьлед за Ельскім пайшлі іншыя раёны: Слуцкі, Шклоўскі, Плешчаніцкі, Койданаўскі і г. далей. Да гэтага часу газэта «Рабселькор» разасылала ўжо на месцы 82.000 макетаў «Ударнік уборачнай». У Слуцку і Шклове, раённыя газэты, дадаткова надрукавалі яшчэ 8.000 макетаў-штодзённак. Для дапамогі раённым газэтам, рэдакцыі газэт «Рабселькор», «Калгаснік Беларусі» і часопісь «Беларуская работніца і сялянка» выслалі спэцыяльныя брыгады. Раённыя газэты таксама накіравалі цэлы рад сваіх брыгад у калгасы і саўгасы для арганізацыі палявых штодзённак. У выніку за месяц у тым вучастку, дзе працуе асноўная частка калгаснікаў. Звычайная завострная палка, якая ўтыкаецца ў зямлю, набіты кавалак дошкі ці фанэры і на ёй газэта, служыць тым прымітыўным пристасаваньнем, якое дазваляе лёгка пераносіць палявую газэту з месца на месца ўсьлед за перасоўваньнем на рабоце калгасных брыгад. У многіх калгасах агульна-калгасныя палявыя газэты (а лі актыўны ўдзел у палявой газэце. Гэты дагавор не застаўся на паперы. Сустрэчны план праведзен у жыцьцё».

Газэта «Рабселькор» 22-га жніўня зьмясьціла цалую старонку вопыту работы палявых штодзённак. Надрукаваныя ў гэтай старонцы карэспандэнцыі з Спуцкага, Дубровенскага, Вушацкага, Буда-Кашалёўскага і Койданаўскага раёнаў пераказваўча гавораць аб вялізнай ролі, якую адыгрываюць палявыя штодзённкі. «Дзякуючы рабоце палявых газэт — піша селькор тав. Чарнуўскі, — Мардашэвіцкі сельсавет, дзе раней калгасы ня былі пераведзены на зьдзельшчыну, ня было ніводнага сацспаборніцтва і ўдарніцтва мабілізаваны штодзённай на аньшыцьцёўленьне гэтых важнейшых задач і стаў у першых радох па ільнаўборцы».

Падобныя прыклады работы штодзённых палявых газэт можна было-б працягнуць яшчэ дзесяткамі з іншых раёнаў БССР. Усё гэта з усёй выразнасьцю гаворыць аб вялікай ролі і месцы палявых штодзённак. Недарма кулакі і іх агентура так ненавідзяць палявыя газэты і ўсякімі мерамі імкнуцца сарваць гэту работу. Так, у Асьвейскім раёне з боку групы падкулачнікаў раздаваліся пагрозы «пачаставаць з-за вугла дэлінай тых, хто піша і баламуціць людзей» (?), а ў калгасе імя Карла Маркса гэтага-ж раёну быў выпадак, калі «пакрыўджаныя» газэтай нацкоўвалі асобныя групы калгаснікаў пайсьці «прыкрыць газэту». У калгасе «Энэргія» Ельскага раёну кулакі «не здаволеныя» работай газэты, падвучылі палявода т. Дубніцкага які прыбег у рэдкалегію штодзённкі і прасіў: «паніньце, браткі, гэтыя газэты, таму, што ў калгасе бражэньне (?), цэлая «калгасная рэвалюцыя».

Як відаць, у гэтым калгасе сапраўды ў выніку работы штодзённкі была рэвалюцыя супроць кулакоў, падкулачнікаў, лодыраў і прагульшчыкаў. На такую іменна рэвалюцыю і заклікана палявая штодзённка.

Гэтыя факты лішні раз сьведчаць, што палявыя штодзённі зьяўляюцца баявым

зьвяном бальшавіцкага друку, правільна б'ючы у мэту, стаяць на перадавых постах бязьлітаснай клясавай барацьбы.

Аб апошнім казка і той вялікі аўтарытэт і любасьць, якую адчуваюць перадавыя калгаснікі-ударнікі да газэт «Ударнік уборачнай». Загадчык вучасткам, калгаснік-ударнік, Круноўскі Міхась (калгас імя Дзяржынскага, Буда-Кашалёўскага раёну) кожны дзень прыходзіў у хату-чытальню і падрабязна расказваў рэдкалегіі аб рабоце лепшых і горшых брыгад, уносіў свае прапановы. Лепшы калгаснік калгасу імя Мархлеўскага (Койданаўскі раён) 65-цігетні стары — тав. Тамашэўскі заявіў на сходзе калгаснікаў: «Хоць я і стары і піша дрэнна, але кожны прыклад добрай і дрэннай работы буду паведамляць нашай газэце.»

У адносінах тэхнікі наладжваньня што жненнага выхаду газэт важна адзначыць неабходнасьць дакладнага жывога інструктажу рэдкалегіі палявых газэт з боку цэнтральных і раённых газэт. Ёсьць ня мала выпадкаў, калі пасланыя макеты з-за адсутнасьці патрабнага інструктажу ляжалі не чапанымі. Поўнага часу ў дзень, калі лепш тэхнічна афармляць газэту, пакуль яшчэ ляжка рэкамандаваць. Гэты вопыт добра не вывучан. У Сушчынскім раёне, як правіла, рэдкалегія выпускае штодзённку вечарам пасьля работы, у Койданаўскім — галоўным чынам у абедзены перапынак, у Полацкім — у калгасе «Чырвоная Полаччына» селькоры нават умудрыліся выпускаць газэту непасрэдна ў полі ўначы (у час начных работ).

Месца выпуску вялікага значэньня не адыгрывае. Важна, каб газэта вывешвалася ў полі ў тым вучастку, дзе працуе асноўная частка калгаснікаў. Звычайная завострная палка, якая ўтыкаецца ў зямлю, набіты кавалак дошкі ці фанэры і на ёй газэта, служыць тым прымітыўным пристасаваньнем, якое дазваляе лёгка пераносіць палявую газэту з месца на месца ўсьлед за перасоўваньнем на рабоце калгасных брыгад. У многіх калгасах агульна-калгасныя палявыя газэты (а брыгадных газэт, на вялікі жаль, пакуль яшчэ мала) пішуцца пад капірку ў некалькі экзэмпляраў і раздаюцца на розных вучастках. У большасьці газэты пішуцца атрамантам ці алоўкам друкаванымі літарамі. Там, дзе газэта выдаецца ў адным экзэмпляры лепш усяго пісаць не разнакаляровымі алоўкамі. Загалоўкі для лепшага выдзяленьня абавязкова трэба пісаць каляровым алоўкам. Вось увесь той даволі не складаны тэхнічны бок выданьня газэты.

Кароткі тэрмін (месячны) работы палявых штодзённак, навіна гэтай справы для БССР, не даў магчымасьці ва ўсёй паўнаце абагуліць багаценькі вопыт. Робяцца толькі першыя спробы. Але адно зусім ясна ўжо зараз. Газэты-штодзённкі зьяўляюцца важнейшым фактарам у справе перабудовы рабселькораўскага руху, праводу сяўбаных, калгасных насьценных газэт на апэрацыйныя мэтады работы, на рашучы паварот іх тварам да вытворчасьці.

Штодзённі зьяўляюцца лепшымі памочнікамі партыйных арганізацый у барацьбе за пасьляховае правядзеньне гаспадарча-палітычных задач. Там, дзе пад кіраўніцтвам партыйнага камітэту і ячэек была разгорнута работа штодзённых палявых газэт, яны прынесьлі і прынесьць калгасальную карысьць. У большасьці калгасаў ініцыям выданьня штодзённак зроблен сапраўдны пераварот у сельскораўскай рабоце. Задача штодзённак зараз — пераключыцца на палі асеньняй сяўбы, на тоні, дзе разгортваецца масавы абмалот.

На зімні перыяд у

ПРАЛЕТАРЫЯТ ФРАНЦЫІ ЎЗЬНІМАЕЦЦА НА АБАРОНУ ПАЛОНЬНІКАЎ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

Год выданьня—XV
№ 234 (4139)
СУБОТА 29 ЖНІЎНЯ 1931
Цана нумара 6 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, СВЯЦІЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27, сакратар—10-74, парт. сакратар—13-50, прамысл.—13-80, сан. зап.—6-19, мясц. і ін. пит.—6-19, замен. Інфарм.—6-14, нач. рэдактар—6-42, нач. гарадскі Інфармацыі—7-[illegible], нач. гарадскі выд.-ав. аддзела—7-[illegible], рэстак—7-31

Дэманстрацыя рабочых.

КАТЫ ПРАЛІЧАЦЦА

НА КРЫВАВЫ РАЗГУЛ ПАЛІЦЭЙШЧЫНЫ

польскія пралетары адказваюць магутнымі дэманстрацыямі пратэсту

ВІЛЬНЯ, 28. (Наш кар.). Зараз няма таго дня, каб у якой-небудзь турме фашысцкай Польшчы, або ў некалькіх адразу не адбывалася галадоўка палітзьняволеных, каб не адбывалася не на жыцьцё, а на сьмерць барацьба нашых братоў па клясе супроць замаху на іх жыцьцё фашысцкіх катаў. Галадоўка ў Пінску, галадоўка на Лукішках, у Горадні, у варшаўскіх турмах, галадоўка ў Брыгідках, у Львове—усё гэта на працягу няпоўных двох апошніх месяцаў. Яшчэ і зараз не скончылася галадоўка ў Львове і Павіяку, а ўжо атрыманы весткі **аб новай галадоўцы ў Сэрбіі** (жаночая турма ў Варшаве) і **ў Тарнопалі.** Коціцца хваля галадовак па ўсёй Польшчы. Нясуцца стогны нашых таварышоў з белапанскіх засьценкаў. Фашызм жорстка распраўляецца, пад кіраўніцтвам вышэйшых прадстаўнікоў улады, з лепшымі прадстаўнікамі рабочай клясы і працоўнага сялянства. Сэрца сьціскаецца ад болі і заклікае кожнага працоўнага да бязьлітаснай помсты.

Сёньня—восьмы дзень галадоўкі на Павіяку і Сэрбіі. Ніякіх вестак з-за турэмных муроў няма. Нікога з сваякоў і блізкіх знаёмых турэмныя каты не дапускаюць. Паліцыя ўведзена ў серадзіну турмы. Знадворку турма так сама абкружана моцным атрадам паліцыі з брамнявікамі і сышчыкамі. Прылеглыя да турмы вуліцы заняты паліцэйскім атрадамі. Паліцыя мабілізавана і знаходзіцца ў баявой гатоўнасьці.

Здалёк відаць выбітыя шыбы ў вокнах турэмных камэр.

Сярод варшаўскага пралетарыяту вялізарнае абурэньне. **Амаль штодня перад будынкам турмы адбываюцца дэманстрацыі пратэсту,** якія жорстка разганяюцца ўзброенай да зубоў паліцэйшчынай.

У Львове і Тарнопалі перад турмою таксама адбываюцца бурныя дэманстрацыі пратэсту. 24 жніўня ў Львове на тэлеграфных правадох і на вагзале былі вывешаны чырвоныя сьцягі з антыдзяржаўнымі лёзунгамі. **У Тарнопалі-ж дэманстранты ў будынку акружнога суда выбілі ўсе шыбы.** Маса дэманстрантаў арыштавана. Пралетарыят Польшчы, пад кіраўніцтвам кампартыі, ідзе на абарону сваіх лепшых таварышоў, кінутых у фашысцкія засьценкі.

Жорсткая расправа фашысцкага суда

ВІЛЬНЯ, 23. У Віленскім акруговым судзе 20 жніўня адбылася справа **А. Шыдлоўскага,** б. вучня віленскай беларускай гімназіі, і **І. Відучынскага** па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці.

На працэсе ў якасьці сьведак выступалі **амаль выключна шпікі і паліцэйскія,** праслухаўшы якіх, фашысцкі суд **прысудзіў Шыдлоўскага да 5 год і Відучынскага — да 4 год катаргі.**

У часе эскартаваньня з турмы ў акруговы суд малады рабочы **Н. Слобік** запратэставаў супроць закаваньня яго ў кайданы паліцэйскімі дзяржымордамі. Словік лёг на зямлю і пачаў крычаць: **«Проч фашысцкі тэрор, проч фашызм».** Вакол падсуднага, якога паліцэйскія цягнулі па зямлі, сабраўся натоўп сялян, што знаходзіліся на кірмашы. За гэта фашысцкі суд **прысудзіў Словіка дадатково на 2 гады катаргі.**

Вялізарнае падзеньне ўкладаў у ашчадкасы

ВАРШАВА. 28. Паглыбленьне эканамічнага крызысу фашысцкай Польшчы, якое давяло да краху некалькі банкаў, з буйным Лодзінскім банкам на чале, выклікала **значнае падзеньне ўкладаў у ашчадныя касы.**

Паводле даных «Статыстычных ведамасьцей «сума ўкладаў у дзяржаўную ашчадную касу на працягу чэрвеня і ліпеня зьменшылася на 19. мільёнаў злотых, у камунальных ашчадкасах падзеньне гэта вызначаецца **ў суме 18.** мільёнаў; у двух ашчадкасах (не камунальных) Львоўская вальводства **падзеньне ўкладаў дасягнула 3 мільёнаў** злотых. Такім чынам, на працягу 2 месяцаў сума ўкладаў у ашчадных касах зьменшылася **на 40 мільёнаў злотых.**

У **Львове,** як паведамляе фашысцкі друк, пацярпеў банкроцтва буйны імпарцёр і экспарцёр футры Дзетфальд. Банкрутства перавышае суму 1,5 мільёны злотых.

Наступленьне капіталістаў на зарплату рабочых і служачых у апошнія часы пашыраецца на ўсе прамысловыя акругі. Саюз прадпрыемцаў мэталюргічнай прамысловасьці ў **Пазнані** сарваў калдагавор і абвясьціў 15-процантнае зьніжэньне зарплаты. Сярод рабочых **панує вялізарнае абурэньне.** У Пазнані ў сучасны момант налічваецца звыш **2.000 беспрацоўных мэталістаў.** Акрамя таго, 500 чалавек працуе ад 2 да 3 дзен у тыдзень. Аб шпаркім росьце беспрацоўя ў Пазнані сьведчыць скарачэньне рабочых у найвялікшай у Пазнані фірме «Гоцэгельскі»: у 1928 годзе працавала там **4.200 рабочых,** у 1929 г. лічба гэта зьменшылася да **3.500,** цяпер у гэтай фірме занята толькі **1.500 рабочых.**

Праўленьне фабрыкі штучных угнаеньняў «Кіеўскі і Шольце» ў Варшаве абвясьціла **25-процантнае зьніжэньне зарплаты.** Рабочыя гэта патрабаваньне капіталістаў **катэгарычна адкінулі.** З прычыны няўступчывасьці прадпрыемцаў, **26 жніўня распачалася забастоўка ўсіх рабочых.**

БАНКРУТСТВА ЯШЧЭ АДНАГО БУЙНЕЙШАГА БАНКУ У НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 25. Абвясьціў аб банкрутстве «Дармштатэр Фольксбанк», які адыгрываў буйную ролю ў прамысловасьці і гандлі ўсёй Варшаўскай акругі.

ВЯЛІЗАРНЫ МІТЫНГ НЯМЕЦКАЙ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 28. Учора ўвечары ў буйнейшай залі Бэрліна — «Спортпалацы» адбыўся масавы мітынг нямецкай кампартыі, камсамолу і рэвалюцыйнай прафапазыцыі. У перапоўненым «Спортпалацы» прысутнічала звыш 15 тыс. рабочых і работніц. Даклад аб палітычным становішчы рабіў член ЦК кампартыі тав. Ульбрыхт. Мітынг прагаласаваў лёзунгам: **«Бар'ер рэфармісцкага здрадніцтва павінен быць зьнішчан, калі пралетарыят хоча прысьці да перамогі».**

Нью-йоркія швэйнікі на мітынгу.

„Прымаем шэфства над палітзьняволеным

Рабочыя і служачыя станцыі Магілеў з абурэньнем пратэстуюць супроць расправы турэмных катаў фашысцкай Польшчы над палітзьняволенымі.

У адказ на адозву ЦК МОПР'ы, Сакалоўскай Беларусі і Зах. Бел. да працоўных усяго сьвету, мітынгуючых і служачых Жлобінскага р-ну выказвае сваю салідарнасьць з працоўнымі масамі Польшчы, якія пад кіраўніцтвам кампартыі ведуць барацьбу з фашысцкай дыктатурай. Удзельнікі мітынгу **заяўляюць рэшчы пратэст супроць нячуванага гупу фашысцкага тэрору ў Польшчы.**

10.000 палітзьняволеных зьдзекі і катаваньні. На глазах стараньні фашысцкай паліцыі **усё тое, што адбываецца ў засценках турмаў,** гонас ахвяр фашысцкага тэрору праз турэмныя краты працуе да шырокіх рабочых **усяго сьвету.** Рабочыя і служачыя адказ на бела-фашысцкі тэрор **наўляюць узвышаць тэмпы па камбінату, уносячы адпачасовы дзенны заработак (600 руб.) у фонд мовай дапамогі палітзьняволеным.**

ГОМЕЛЬ, 24 жніўня. (БЕЛТА). Хваля абурэньня супроць фашысцкага тэрору ў Польшчы **перакінулася вёску, калгасы і саўгасы.** У радгасаў адбыліся мітынгі пратэсту, прымалі ўдзел калгасьнікі і аднікі. Розалюцыі пратэсту пратэстуюць супроць фашысцкіх зьвярстваў, якія ўчынялі крывавыя расправы лепшымі нашымі братамі па клясе.

Ведаючы, што наша моц у вёсцы і калгасных плянаў, у замацаваньні калгасаў, калгасьнікі і аднаасобнікі вызваліся пашырыць **пасеўную на 20 проц. Калгас «Чырвоны правёў дадатковую падпіску на рашаючы».** Калгасьнікі калгасу **«Лініна** разам з аднаасобнікамі вёскі Красава, Міхалкоўскага сельсавета **чалі збор сродкаў у фонд эмоцыянальнай дапамогі палітзьняволеным.** Камунмовай дапамогі пачынае разгортвацца ўсім горадзе і прыгарадных раёнах.

ЖЛОБІН, 26 жніўня. (БЕЛТА) У адказ на адозву ЦК МОПР'ы, Сакалоўскай Беларусі і Зах. Бел. да працоўных усяго сьвету, мітынгуючых і служачых Жлобінскага р-ну выказвае сваю салідарнасьць з працоўнымі масамі Польшчы, якія пад кіраўніцтвам кампартыі ведуць барацьбу з фашысцкай дыктатурай. Удзельнікі мітынгу **заяўляюць рэшчы пратэст супроць нячуванага гупу фашысцкага тэрору ў Польшчы.**

Бурныя мітынгі пратэстаў ва Францыі

Як паведамляе «Юманітэ», ПА ЎСЁЙ ФРАНЦЫІ АДБЫВАЕЦЦА КАМПАНІЯ ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ БЕЛАГА ТЭРОРУ Ў ТУРМАХ ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ. Камуністычная партыя склікала ў Парыжы вялікі мітынг, на якім ухвалена рэзалюцыя пратэсту супроць замаху фашысцкай дыктатуры на жыцьцё палітзьняволеных. Рэзалюцыя называе гэты замах **АКТАМ ФАШЫСЦКАГА БАРБАРСТВА І ПАДРЫХТОЎКАЙ АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ.** Удзельнікі мітынгу пасылаюць брацкія прывітаньні палітзьняволеным у Польшчы.

ОРГАН КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ —«ЮМАНІТЭ» — ЗВАРАЧАЕЦЦА ДА ПРАЦОЎНЫХ МАС ФРАНЦЫІ З ЗАКЛІКАМ ДА ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ БАРБАРСКІХ КАТАВАНЬНЯЎ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ТУРМАХ БЕЛАПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ. Газэта падае цэлы рад новых фактаў нячуваных катаваньняў у турмах рэвалюцыянэраў. У Петракове палітычныя зьняволеныя абвясьцілі галадоўку супроць барбарскага абыходжаньня з імі. За гэта на іх надзелі «сьмірцельныя» рубашкі, зьвязаўшы па двох, плячыма адзін да аднаго, а рукі скавалі кайданамі. Пасьля гэтага іх скатавалі да страты прытомнасьці. Адзін малады рабочы ад пабояў памёр.

У турме ў Плоцку аднаго маладога палітзьняволенага, цяжка хворага, кінулі ў карцэр. З беспрацоўнымі, якія былі арыштаваны 21 ліпеня, абыходзяцца турэмныя каты, як з крымінальнымі. Ім забаронена атрымліваць харчы ад сваякоў. Абыходжаньне з жанчынамі, нават з маткамі з груднымі дзяцьмі, зьяўляецца проста жудасным.

РУМЫНІЯ ПЕРАЖЫВАЕ АНАРХІЮ

ВЕНА. Як паведамляюць з Бухарэсту былы міністар асьветы лідэр народнай партыі Гога ў інтэрвію, надрукаваным у газэце «Адэвэруль» заяўляе, што «ў Румыніі мяецца **ўсе адзнакі перадрэвалюцыйнай сітуацыі»** і што «Румынія **стаіць напярэдадні цяжкіх перажываньняў».** Гога канстатуе, што становішча Румынскай гаспадаркі абастрылася да апошніх межаў і што разваг румынскіх фінансаў і катастрафічна абвостраны аграрны крызіс прыняў нябачаныя дагэтуль разьмеры. Гэта характарызуе культурнае разлажэньне Румыніі як вельмі трывожны сьцітом распаду румынскага дзяржаўнага ладу. Дзяржаўны адміністрацыйны апарат — заяўляе Гога, — зусім бясэільны. Народныя масы **страцілі давер'е да кіраўнікоў, уся краіна перажывае анархію».**

Усебеларуская нарада рэдактароў газэт жывёлагадоўчых раёнаў

НАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б 29-га ЖНІЎНЯ, У 12 ГАДЗ. ДНЯ, У МАЛОЙ ЗАЛІ ЦК КП(б)Б, КУЛЬТПРОПАМ ЦК СКЛІКАЕЦЦА ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРОЎ РАЁННЫХ ГАЗЭТ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ РАЁНАЎ З УДЗЕЛАМ ПРАДСТАЎНІКОЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ УСТАНОЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ (ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫ СЭКТАР ЦК КП(б)Б, НКЗБ, КАЛГАСЦЭНТР, МАЛАКОЦЭНТР І ІНШ.).

ПАРАДАК ДНЯ

1. АБ РАЗГОРТВАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ І ЗАДАЧЫ ДРУКУ (ДАКЛАДЧ. т. т. МАСЮКОЎ І АЎЧЫНЬНІКАЎ).

2. УДЗЕЛ ДРУКУ Ў ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ АДОЗВЫ ЦК І СНК (СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ—«КАЛГАСЬНІКА БЕЛАРУСІ», «ОРКІ», «СЕЛЬГАСПАДАРЧАГА РАБОЧАГА»; РАЁННЫХ ГАЗЭТ—«УДАРНІКА КОЙДАНАЎШЧЫНЫ», «КАЛГАСЬНІКА МАЗЫРШЧЫНЫ», «КАЛЕКТЫВІСТА» (УВАРАВІЦКІ РАЁН), «ЛЕНІНСКАГА ШЛЯХУ» (СЛУЦКІ РАЁН), «СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ» (КАСЬЦЮКОВІЦКІ РАЁН), «КАЛГАСНАЙ РАДЫЁ-ГАЗЭТЫ» (МЕНСК).

3. АБ ШТОДЗЕННЫХ ПАЛЯВЫХ НАСЬЦЕНГАЗЭТАХ (ВЕРЖБАЛОВІЧ).

„Панскія лясы, няхай гараць"

ВІЛЬНЯ, 25. У Столінскім павеце капя БЕЛАЙ ГАРЫ у лесе графа Плятэра з невядомай прычыны выбухнуў вялізарны пажар, які працягваўся 3 дні. Згарэла звыш 100 гакт. лесу. З ВАКОЛЬНАГА СЯЛЯНСТВА НІ АДЗІН ЧАЛАВЕК НЯ РУШЫЎ РАТАВАЦЬ ГРАФСКІ ЛЕС.

Пажарная дружына, якая прыбыла з вёскі ЗЛОТЫ, АДМОВІЛАСЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ГАШЭНЬНІ ПАЖАРУ, ТЛУМАЧАЧЫ СВАЁ СТАНОВІШЧА ВАРОЖЫМІ АДНОСІНАМІ СЯЛЯНСТВА ДА ПАМЕШЧЫКАЎ. І ТОЛЬКІ ПАД ПАГРОЗАЙ УЗБРОЕНАЙ РАСПРАВЫ ПАЛІЦЭЙШЧЫНА ПРЫМУСІЛА ПАЖАРНУЮ ДРУЖЫНУ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У РАТАВАЎНІ ЛЕСУ.

ФАКТ ГЭТЫ ЯРКА СЬВЕДЧЫЦЬ АБ ВЯЛІЗАРНЫМ УЗРОСЬЦЕ КЛЯСАВАЙ НЯНАВІСЬЦІ ДА АБШАРНІКАЎ З БОКУ ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА.

З КАПІТАЛІСТЫЧНАГА РАБСТВА У КРАІНУ ВОЛЬНАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

Адозва швэдаў-калёністаў, якія вярнуліся ў СССР, да працоўных Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету

ЛЕНІНГРАД. У 1929 г. мы, шведы-калёністы, падпісалі агітацыі кулачча і папа Гааса і пакінулі Савецкі Саюз, накіраваўшыся ў Швэцыю, дзе нам абяцалі даць зямлю, дамы, кароў і рабочую скаціну.

Праз два горкія гады, поўныя непраўдападобных цярпеньняў і пакут у капіталістычнай Швэцыі, мы, раскіданыя па розных канцох краіны, нарэшце аб'ядналіся і, ня гледзячы на ўсялякія перашкоды буржуазна-памешчыцкага ўраду, зноў у родной краіне працоўных усяго сьвету, у СССР. Нам хацелася-б, каб аб нашым горкім вопыце ведалі працоўныя ня толькі СССР, але і ўсяго сьвету. НЕ ДАМЫ, НЕ РАБОЧУЮ СКАЦІНУ ЦІ ІНШЫЯ ПАЛЕПШАНЬНІ ДАЛА НАМ КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ «БАЦЬКАЎШЧЫНА», А «ЖАЛКІ» ЛЁС РАБОЎ-БАТРАКОЎ У ШВЭДЗКІХ ПАМЕШЧЫКАЎ І КУЛАКОЎ.

ТАВАРЫШЫ РУСКІЯ СЯЛЯНЕ І РАБОЧЫЯ!

Мы зрабілі вялікую памылку, лёгкаверна аднесьліся да папоўскіх пістоў і купацкай агітацыі.

Цэлых два гады мы жылі на памешчыцка-капіталістычнай катарзе, пастаянна марачы зноў вярнуцца ў Савецкі Саюз.

Мы бясконца ўдзячны савецкаму ўраду за тое, што нам прадаставілі магчымасьць зноў вярнуцца ў бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету.

Мы бясконца ўдзячны працоўным СССР за цёплы, брацкі прыём. АД ГЭТАГА ЧАСУ БЕЗ ПАПА, БЕЗ КУЛАКОЎ МЫ, НЕ ШКАДУЮЧЫ СІЛ, БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА РАЗАМ З УСІМ КАЛГАСНЫМ СЯЛЯНСТВАМ, РАЗАМ З УСІМІ ПРАЦОЎНЫМІ ЗА ДАЛЕЙШУЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАБУДОВУ КРАІНЫ, ЗА СУЦЭЛЬНУЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ, ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ КУЛАЦТВА.

Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!
Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр тав. СТАЛІН!

Перабоі ў выпечцы хлеба будуць ліквідаваны

ДЫРЭКТАР ХЛЕБАЗАВОДУ ЗЬНЯТ З РАБОТЫ

За апошнія дні ў Менску стварыліся вялікія перабоі ў забесьпячэньні насельніцтва хлебам. Асноўнымі прычынамі перабояў, як выявілася, служылі **нядбайныя адносіны з боку дырэкцыі хлебазаводу** да забесьпячэньня нармальнай выпечкі хлеба пры дапамозе **рэзэрвовых хлебапякарань.** Апошнія ў патрэбны момант ня былі падрыхтаваны да экспляатацыі. Адна хлебапякарня была затоплена вадой і ўвесь час дырэкцыя хлебазаводу ня прымала мер для рамонту яе. Другая пякарня бяз усякага дазволу мясцовых арганізацый была занята дырэкцыяй хлебазаводу пад выраб мармэляду. Такім чынам Менск фактычна застаўся без рэзэрвовых хлебапякарань.

Белпрамхлеб не ўстанавіў належнага кантролю за становішчам заводу і яго дапаможных прадпрыемстваў і ня ведаў, як стаіць справа з выпечкай хлеба.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу павіў **зьняць з работы дырэктара хлебазаводу за нядбайныя і безадносныя да працы.**

Белпрамхлеб паказала на пушчальнасьць бездапаможных і да забесьпячэньня насельніцтвам.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу абвінаваціў **праўленьне МЦРК неадкладна** ўвесьці строгі кантроль за выдачай хлеба на вызначаных пунктах у сувязі з тым, што па сетцы МЦРК за апошні час нагляда значнае перавыдаткаваньне хлеба.

Праграма перадач Менскай радыёстанцыі

СУБОТА 29-га ЖНІЎНЯ

6—00—Фізкультура і раніцн. пав. (трансляцыя Масквы).
7—00—Перадача радыёграм.
11—00—13—00 — Рабочы поўдзень (трансляц. Масквы).
17—25—Прагноз надвор'я на заўтра.
17—30—Канцэрт для выходн. і зьмен. рабочых.
18—30—Перадача на польскай мове (газэта).
18—55—Музычны адпачынак.
19—00 р-г. «Піянэр Беларусі» з муз. ілюстрац.
19—55—Музычны адпачынак.
19—30—Р-г. «За бальшавіцкія тэмпы»
20—00—Р.-г. «Камсамолец Беларусі».
20—25—Музычны адпачынак.
20—30—Р.-г. «Калгасны заклік»
20—55—Музычны адпачынак.
21—00—Агранамічная парада р.-г. «Калгасны заклік»
21—30—Канцэрт
23—30—Вячэрні выпуск р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы».

НЯДЗЕЛЯ 30-га ЖНІЎНЯ

6—00—Фізкультура і раніцн. (трансляц. Масквы).
7—00—Перадача радыёграм.
10—00—11—00—Багаслужэнне р.-г. «Калгасны заклік».
11—00—13—00 — Рабочы поўдзень (трансляцыя Масквы).
17—25—Прагноз надвор'я на заўтра.
17—30—Канцэрт для выходн. і зьмен. рабочых
18—30—Літаратурна-музычная дата.
19—00—р.-г. «Піянэр Беларусі» ілюстрацыяй.
19—30—р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы»
19—55—Музычны адпачынак.
20—00—р.-г. «Камсамолец Беларусі, старон.
20—25—Музычны адпачынак.
20—30—р.-г. «Калгасны заклік».
20—55—Музычны адпачынак.
21—00—Гутаркі р.-г. «Камсамолец Беларусі».
21—00—Канцэрт
23—30—Вячэрні выпуск р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы».

Адказны рэдактар С. БУДЗІН

„Чырвоная Зорка" — ШПАРКАСЬЦЬ І НАЦІСК камэдыя ў 8 частках. Звыш праграмы ТРЫМАЙ ЗЛОДЗЕЯ.
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — Новы выдатны мастацкі сытавы фільм 2 МАТКІ 2 драма ў 6 частках.
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. — Мастацкі фільм ПРАКАЖОНАЯ драма ў 6 частках.
„Інтэрнацыянал" Пач. 1 с. у 7 ч. в. — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ПАЎНОЧНАЕ КАХАНЬНЕ драма ў 7 часткі. Звыш прагр. кіно-фасон. БДК № 14.
„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — С 22 жніўня САВУР МАГІЛА Пачатак з 1 г. дня
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8-30 і 11 Каса—з 5 год. — Ігар Ільінскій у карціне ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ камэдыя ў 8 частках

Дэканат Менскага рабфаку пры БДУ прапануе ўсім студэнтам дзённага і вячэрняга аддзяленьняў ЗЬЯВІЦЦА НА ЗАНЯТКІ да 1-га верасьня. Прыём заяў для залічэньня на 1-шы курс працягваецца да 10 верасьня. Прыймовыя іспыты пачнуцца 22 верасьня.

МЕНСКІ Дошкольны Тэхнікум АБВЯШЧАЕ, што прыём заяў на I і II КУРС белар. і кірэйскага аддзяленьняў і I КУРС польскага аддзяленьня ПРАЦЯГНУТЫ да 15 верасьня 1931 г. Дырэктар тэхнікуму ОШАРАЕЎ.

Гомельскае аддзяленьне Белдзяржкіно даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых арганізацый, што 20 жніўня пры рамонтнай майстэрні Гомдзяржкіно (Камунарава, 2) АДКРЫТА Ўстановачнае бюро кіно-стацыянарак. Прымаюцца заявы на абсталяваньні кіно-будак і ўстаноўцы стацыянарных кіно-апаратаў. Заказы накіроўваць па адрасе: гор. Гомель, Камунарава, 2, БЕЛДЗЯРЖКІНО.

У парадку разьвіцця пастановы СНК СССР ад 21 чэрвеня 1931 г. аб паскарэньні падрыхтоўкі спэцыялістаў тэхнікаў з найбольш падрыхтаваных рабочых і на падставе загаду па ВСНГ СССР за № 49 ад 11 ліпеня 1931 г. Бабруйскі лесатэхнічны тэхнікум АБВЯШЧАЕ набор на 2-ці курс 30 асоб і на 3-ці курс 30 асоб. Прымаюцца найбольш здольныя, пасьпяваючыя студэнты вячэрняга рабфаку, скончыўшыя ФЗУ на базе 7-годкі, скончыўшыя школу заводзкага вучнёўства павышанага тыпу, рабочыя, якія маюць незакончаную сярэднюю тэхнічную асьвету, а таксама скончыўшыя школы 2-й ступені з выпорчым стажам ня менш 2-х год. Тэрмін падачы заяў і камандыровак да 10 верасьня 1931 г. Набор будзе праводзіцца з папярэдзімі іспытамі. Матар'яльныя умовы дзб прынятых на гэтыя курсы агульныя для нашага тэхнікуму. Заявы падаваць на імя тэхнікуму: г. Бабруйск, Савецкая, 76. Дырэктар тэхнікуму П. Штыцко.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1-шы курс Мсьціслаўскага Педтэхнікуму і на аднагадовыя педкурсы працягнут да 15 верасьня 1931 г.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакументу 1 р.

Рэдакцыя „Зьвязды" і ЦКК-РСІ склікаюць НАРАДУ па пытаньнях БУДАЎНІЦТВА Ў ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ САЎГАСАХ. На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі: Лесбелу, Белсельбуду, Белмэталяб'яднаньня, Сьвіноваду, Белсаўгастрэсту. Нарада адбудзецца 30 жніўня ў 7 г. вечара, у кабінэце рэдактара газэты „Зьвязда" (Савецкая, 63, 3 паверх).

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяртацца па тэл. 7-81

ДАВОДЗІЦЦА да ведама ўсіх Раённых КП(б)Б і паступаючых у Гомельскую саўпартшколу, што з 1-га кастрычніка г. г. пры саўпартшколе адкрываецца польскае аддзяленьне: Жадаючыя паступіць на польскае аддзяленьне саўпартшколы павінны падаць заявы не пазьней 15-IX у адпаведныя райкомы КП(б)Б. Аб умовах прыёму можна даведацца ва ўсіх райкомах і гаркомах КП(б)Б. Нам. загадчыка саўпартшколы Нуліноў.

РАБФАК хэміка-тэхналягічнага інстытуту абвяшчае, што прыём заяў на першы курс ПРАЦЯГНУТ да 10 верасьня. Правілы прыёму, даведкі і прыём заяў у канцылярыі рабфаку ад 9 да 4 гадз. (Менск, Зямляробскі зав. № 3). ДЗКАНАТ РАБФАКУ.

Беларускі Фінансава-Эканамічны інстытут АБВЯШЧАЕ, ШТО ўступныя іспыты ўпоў паступаючых пачнуцца з 7-га верасьня 1931 г. у 10 гадзін раніцы, у галоўным корпусе БДУ (аўдыторыя 203). Асобы якія атрымалі паведамленьне аб іспытах, павінны зьявіцца ў інстытут да паказанага часу. ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1-ы КУРС асьненяга набору — 1931 году працягваецца да 10-га верасьня 1931 г. Заявы пасылаць у НКФ БССР (сэктар кадраў). Правілы прыёму глядзіце газэты „Зьвязда" № 213 ад 8 VIII—31 г., „Савецкая Беларусь" ад 27-VII і 1-VIII—і „Калгаснік Беларусі"—ад 29-VII і 3-VIII—31 г. Дырэкцыя.

БРАГІНСКІ дзяржаўны тэхнікум буйнай рагатай жывёлы і малочнай прамысловасьці ПРАЦЯГВАЕ ПРЫЁМ ЗАЯЎ на асенні набор студэнтаў. Умовы прыёму, як і ў іншыя тэхнікумы. Асобы, якія маюць практычны стаж на жывёлагадоўлі або на малочнай справе, ня скончыўшыя 7-годкі, пры прыёме карыстаюцца льготамі. Прынятых у тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатамі і стыпендыяй. Тэхнікум рыхтуе агранома-зоатэхнікаў і агранома-малочнай прамысловасьці. Заявы накіроўваць па адрасе: м. Брагін, БССР, Тэхнікуму. Заняткі пачнуцца: на аддз. малочнай прамысловасьці—15 верасьня, на аддз. буйнай рагатай жывёлы—1 кастрычніка 1931 г. Дырэктар тэхнікуму ВАРОДСКІ.

Менск. друкарня «Зьвязды»